БУДУЦЬ
СВАЕ...
САМАЛЁТЫ
4





ГАДАВАЦЬ
ДЗЯЦЕЙ ТРЭБА
Ў ГЛЫБІНЦЫ
МС

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 СНЕЖНЯ 2024 г.
СЕРАДА
№ 236 (30370)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## КОРАТКА

- Сёння 35-гадовы юбілей адзначае Цэнтральная выбарчая камісія. Яе калектыў з гэтай нагоды павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.
- **Снежань у Беларусі чакаецца цяплейшым, чым звычайна.**
- «Камп'ютарнае мадэляванне і распрацоўка вэбдадаткаў». У БДУ з'явіцца новая спецыяльнасць.
- **Мінсувязі аб перавагах беларусаў у інтэрнэце: YouTube — самы масавы, TikTok — самы папулярны.**
- Рэспубліканскі патрыятычны цэнтр у Брэсцкай крэпасці пачне працаваць з 2025 года.
- **Міністэрства аховы здароўя ўстанавіла гранічныя тарыфы на платныя прыёмы ўрачоў-спецыялістаў.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ЛАБАЗНАЎ, начальнік галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Мінпрыроды:**

*«За бягучы перыяд 2024 года апраўдвальнасць прагнозаў надвор'я ад Белгідрамета склала: на наступныя суткі — 98,1 працэнта, на другія і трэція суткі — 97,4 працэнта. У агульнасусветнай практыцы прымальнымі і паспяховымі лічацца кароткатэрміновыя прагнозы надвор'я з апраўдвальнасцю больш як 85 працэнтаў. Высокі ўзровень прафесіяналізму нашых сіноптыкаў пацвярджаецца аб'ектыўнымі паказчыкамі».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ДАЛЕЙ БЕЗ НАВУКІ МЫ РАЗВІВАЦЬ КРАІНУ НЕ ЗМОЖАМ»

## Чаму даследаванні дзеля даследаванняў — не беларускі варыянт



Фота БелТА.

**Праблемы і перспектывы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі разгледзелі на ўзроўні кіраўніка дзяржавы. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з рабочай групай па аналізе дзейнасці НАН Беларусі. Група створана па распараджэнні кіраўніка дзяржавы ў чэрвені гэтага года. Яна працуе на пастаяннай аснове і вывучае пытанні практыкаарыентаванасці і выніковасці навуковых даследаванняў і распрацовак вучоных НАН Беларусі, укаранення распрацовак у галіны эканомікі, экспарту навукова-тэхнічнай прадукцыі. Кіраўнік дзяржавы рэгулярна сустракаецца з членамі рабочай групы. Пытанні разглядаюцца розныя, але нязменным застаецца ключавы пасыл Прэзідэнта — сур'ёзна падысці да вывучэння праблем Акадэміі навук і прыняць адпаведныя рашэнні. Логіка цалкам зразумелая: без навукі развіваць краіну немагчыма.**

«На парадку дня — размова аб тым, як будзем жыць — з навукай ці без. І як будзе развівацца наша навука, найперш акадэмічная», — задаў тон размовы кіраўнік дзяржавы. Ён растлумачыў, чаму надае вялікае значэнне і ўдзяляе ўвагу гэтаму пытанню: «Без эфектыўнай акадэмічнай навукі развіццё краіны будзе праблематычным. Але з такой навукай, як у нас у Нацыянальнай акадэміі навук, мы не паскорымся і поспехаў не дасягнём». Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што гэта не проста яго сцвярджэнні, а высновы, якія вынікаюць з матэрыялаў, падрыхтаваных спецыялістамі. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што яму на стол паклалі два даклады: адзін — рабочай групы, другі — НАН Беларусі, палажэнні якога з'яўляюцца кансалідаванай пазіцыяй кіраўніцтва НАН і навуковай супольнасці. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што варта прааналізаваць усе палажэнні гэтых дакладаў, вылучыць і абмеркаваць асноўныя праблемы, акрэсліць шляхі іх вырашэння. А затым трэба сабрацца ў Акадэміі навук на сход.

### Будзе вынік — бясплатна ніхто працаваць не будзе

«Тэма для краіны архіважная, — канстатаваў Прэзідэнт. — Я ўжо сказаў: далей без навукі мы развіваць краіну не зможам. Усё, што мы маглі выціснуць інтэнсіўна і экстэнсіўна з таго, што ў нас ёсць у краіне, найперш у эканоміцы, мы ўжо зрабілі. Далей трэба развівацца, абапіраючыся на навуку. Без навукі нікуды».

СТАР. 2-3

Спецыяльны рэпартаж

# «Гэта не толькі пра бізнес, але і пра чалавечыя адносіны»

## Як закрыццё польскіх пунктаў пропуску паўплывала на падарожнікаў і жыхароў пагранічча

**Да сакавіка 2020 года ездзіць у Польшчу можна было праз тры аўтадарожныя пасажырскія пункты пропуску ў Брэсцкім рэгіёне — Дамачава, Брэст і Пясчатка. Больш за чатыры гады таму пад маркай пандэміі COVID-19 Польшча ў аднабаковым парадку закрыла свае пункты пропуску Славатычэ (Дамачава) і Палаўцы (Пясчатка). Нягледзячы на тое што ўсе каранавірусныя абмежаванні ўжо даўно адменены, работа ў двух міжнародных пунктах пропуску да гэтага часу не адноўлена. Колькі часу займае перасячэнне граніцы і як закрыццё пунктаў пропуску адбіваецца на людзях? Як пункт пропуску Дамачава дапамагаў «разгрузіць» Брэст у перыяды вялікай загружанасці? Як паўплывала закрыццё сумежнага пункта пропуску на жыццё ў гарадскім пасёлку Дамачава і што пра гэта думаюць мясцовыя жыхары? У пошуках адказаў на такія пытанні мы накіраваліся на беларуска-польскую граніцу.**

СТАР. 5



Жыллё

# ПРАДАЎЦЫ КВАТЭР ПАГАДЖАЮЦЦА НА ЗНІЖКІ

## Уласнікі карэктуюць свае прапановы

**Першыя званочкі прагучалі на другасным рынку жыллёвай нерухомасці Мінска яшчэ ў другой дэкадзе лістапада. Тады за тыдзень прадаўцы знізілі цэны амаль на 600 кватэр — гэта максімальнае значэнне сёлета. Сярэдні памер зніжкі вар'іраваўся ад 1000 да 3500 долараў, у выніку чаго сярэдні кошт квадратнага метра знізіўся да 1650 долараў за квадратны метр. Гэта закранула ўсе тыпы кватэр і амаль усе раёны. У разрэзе колькасці пакояў зніжэнне цэн назіралася па ўсіх тыпах кватэр, мацней за ўсё ў трох- і чатырохпакаёвых — мінус 0,8 % і 0,9 % адпаведна.**

У той жа час колькасць аб'яў аб продажы кватэр на рынку трохі падрасла (плюс 0,6 %). Пры гэтым рынак папоўніўся самымі запатрабаванымі аднапакаёвымі і двухпакаёвымі кватэрамі, выбар якіх павялічыўся на 3 % і 4 % адпаведна. Колькасць трохпакаёвак у продажы скарацілася на 2 %.

СТАР. 6

ISSN 1990 — 763X
24236>
9 771990 763008

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ
Ідзе падпіска на І квартал і І паўгоддзе 2025 года.
Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцовы.



# «ДАЛЕЙ БЕЗ НАВУКІ МЫ РАЗВІВАЦЬ КРАІНУ НЕ ЗМОЖАМ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, інвестыцыі ў навуку і тэхналогіі сталі ключавой умовай дабрабыту дзяржавы, залогам паступальнага канкурэнтнага развіцця. «Мы ўкладваемся ў айчынную навуку, падтрымліваем новыя навуковыя кірункі, ствараем максімальна спрыяльныя ўмовы. На жаль, Акадэмія навук не стала драйверам апераджальнага навукова-тэхнічнага развіцця краіны на цяперашнім этапе. У нас крытычна мала прарыўных навуковых дасягненняў. Ад дзейнасці акадэміі мы не бачым той аддачы, на якую разлічвалі. Няма манетызацыі яе даследаванняў і распрацовак. А гэта галоўны крытэрый ацэнкі эфектыўнасці. У адваротным выпадку ўзнікае пытанне: навошта нам такая Акадэмія навук? Будзем тады развіваць універсітэцкую, галіновую навуку».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ведае пра размовы аб тым, што навуцы трэба даваць больш грошай. «А я сказаў бы так: будзе вынік — бясплатна нічто працаваць не будзе. У даўгу не застанёмся», — заявіў ён.

Па словах беларускага лідара, названыя праблемы адносяцца не толькі да Акадэміі навук, але і да Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях і галіновых міністэрстваў. «Можа, нават найперш да іх. Дзе ў такім выпадку каардынацыйная і кіруючая роля ДКНТ? А гэта ваша асноўная функцыя, для чаго вы і ствараліся. Аналіз навуковых праграм паказвае, што міністэрствы ў іх фактычна не ўдзельнічаюць. Іх практычна няма ў ліку заказчыкаў. Гэта каласальная недапрацоўка ўрада. Няўжо ў галін няма запыту на навуковыя распрацоўкі? — паставіў пытанні Прэзідэнт. — Як можна было дапусціць, што настолькі запатрабаваныя і найбольш фінансаваныя дзяржавай кірункі, такія як, напрыклад, беспілотнікі, космас, лічбавыя і біятэхналогіі, у прамым сэнсе аддадзены на водкуп Акадэміі навук? Яна сама сабе заказчык, выканаўца і кантралёр. Як у гэтых сферах можна абысціся без спецыялістаў-практыкаў, якія разумеюць, што менавіта трэба эканоміцы? Таму і атрымліваецца, што няма ні плёну, ні вінаватых, спытаць няма з каго».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што даследаванні дзеля даследаванняў, калі яны не адпавядаюць задачам развіцця краіны, — гэта сізіфава праца. Ён нагадаў, што да пытання, як зрабіць так, каб у навуковай сферы быў вынік, які адпавядае запытам рэальнага сектара эканомікі, падступаліся неаднаразова. Цяпер, па словах Прэзідэнта, час нарэшце выпрацаваць канкрэтныя меры.

## «Мне патрэбна рэальная карціна ў Акадэміі навук»

«У новую пяцігодку навука ва ўсіх яе формах — акадэмічная, галіновая, «вузаўская» — павінна ўвайсці практыкаарыентаванай, заточанай на той жа вынік, што і эканоміка краіны», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт яшчэ раз падкрэсліў, што яму на разгляд прадстаўлена другая справаздача рабочай групы па аналізе дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з прапановамі па ўдасканаленні яе работы. Ён адразу папярэдзіў: размовы аб тым, што Камітэт дзяржкантролю, які курыруе дзейнасць рабочай групы, нічога не разумее ў навуковай дзейнасці, недарэчныя. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што да аналізу дзейнасці акадэмічнай навукі былі прыцягнуты спецыялісты — вучоныя, функцыянеры, у склад рабочай групы ўвайшлі людзі з навуковага асяроддзя, здольныя з веданнем справы разабрацца ў наяўных праблемах. «Мне патрэбна рэальная карціна, якая складваецца ў Акадэміі навук. Мне не трэба на кагосьці наязджаць, наступаць і гэтак далей. Патрэбна рэальная карціна, каб краіна развівалася», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён зрабіў акцэнт на тым, што група дзейнічае пастаянна. Гэта неабходна для таго, каб прааналізаваць кожны пласт у арганізацыі дзейнасці Акадэміі навук.

Прэзідэнт заклікаў усіх выступаць па сутнасці, без адыходаў убок. «Усе вашы прапановы павінны быць рэалізаваныя на практыцы, ніякіх навуковых спрэчак тут быць не павінна. Усе прапановы павінны ў тым ліку ўлічваць бягучую сітуацыю ў айчыннай навуцы і галоўнае — перспектывы яе развіцця. Яшчэ раз падкрэсліваю: сённяшняя нарада плаўна перацякае ў акадэмічны сход з запрашэннем туды членаў урада, ДКНТ і іншых для таго, каб канчатковa прыняць рашэнне, як будзем жыць далей, як будзем развіваць нашу акадэмічную навуку», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## У чым корань праблем НАН Беларусі і як іх вырашаць

Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю, кіраўнік рабочай групы Васіль Герасімаў расказаў, што рабочай групай праведзены аналіз дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук па пытаннях практыкаарыентаванасці і рэзультатыўнасці навуковых даследаванняў і распрацовак. Прычым кожны з членаў рабочай групы працаваў не адасоблена, а прыцягваў яшчэ спецыялістаў. «Ну, правільна, параіцца», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Васіля Герасімава, падчас аналізу выйшлі на шэраг ключавых праблем, кожная з якіх складаецца з комплексу прычын.

**Першае.** Адсутнічае адзіная стратэгія фарміравання навуковых праграм. «Акадэмія навук у адной асобе выступае і заказчыкам, і выканаўцам навуковых праграм. Пры гэтым сама іх і ацэньвае па розных падыходах. Адсюль вялікая колькасць распрацовак, якія проста пыляцца на паліцы», — падкрэсліў Васіль Герасімаў. Паводле яго слоў, з пяцігодкі ў пяцігодку ў праграмы даследаванняў уключаюцца падобныя заданні, і многія з іх да мэты нават не набліжаюцца. Задачы і мэты навуковых праграм фарміруюцца зыходзячы з існуючых у асобных інстытутаў магчымасцяў і кампетэнцый, а не патрэб эканомікі. «У выніку ў НАН Беларусі выконваюцца даследаванні, адарваныя ад патрэб рэальнага сектара. А самі галіновыя дзяржорганы часта не ведаюць аб распрацоўках акадэміі, якія могуць быць ім карысныя. Як вынік, важныя кірункі застаюцца без належнай увагі», — дадажыў кіраўнік рабочай групы.

Таксама, паводле слоў Васіля Герасімава, распрацоўкі НАН не аказваюць істотнага ўплыву на імпартазамяшчэнне. Значная частка работ выконваецца для ўласных патрэб інстытутаў НАН або ўкараняецца толькі на сваіх магутнасцях, гэта значыць, не маштабуецца. Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях не выбудаваў эфектыўнае кіраванне інавацыйнай сферай. Неналежным чынам вядзецца работа па пошуку і рэалізацыі стратэгічных праектаў.

**Другое.** Бюджэтнае фінансаванне размяркоўваецца Акадэміяй навук пераважна на праграмы, якія не патрабуюць камерцыялізацыі. Члены рабочай групы ўпэўнены, што значна больш працэнт трэба накіроўваць менавіта на практыкаарыентаваныя праграмы.

Васіль Герасімаў звярнуў увагу на грувасткую структуру Акадэміі навук. Ён адзначыў, што ў структуры НАН створаны дзяржаўныя вытворчыя аб'яднанні, якія не выконваюць ускладзеныя на іх кіруючыя функцыі. У сувязі з гэтым працоўная група сканцэнтруе ўвагу на аптымізацыі структуры кіравання акадэміі і сеткі яе арганізацый.

**Трэцяе.** Праблемнае пытанне — розныя падыходы да ацэнкі вынікаў навуковых праграм. Крытэрыі ацэнкі ўстаноўлены толькі для навукова-тэхнічных праграм. Гэты від праграм самы эфектыўны, бо забяспечвае поўны цыкл навуковых распрацовак ад стварэння прадукцыі да яе серыйнага выпуску. Як адзначыў Васіль Герасімаў, праграмы навуковых даследаванняў не змяшчаюць патрабаванняў пераходу ў навукова-тэхнічныя праграмы і акупнасці бюджэтных сродкаў. Паводле яго слоў, НАН, выступаючы заказчыкам галіновых праграм замест міністэрстваў, сутыкаецца з праблемамі ўкаранення распрацаванай прадукцыі і, як вынік, нізкай акупляльнасцю.

Яшчэ адзін блок праблем звязаны з кадравай палітыкай. Паводле слоў кіраўніка рабочай групы, аслаблены напрамкі падрыхтоўкі навуковых кадраў. Ёсць складанасці з запаўненнем вакансій акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў па прыярытэтных кірунках развіцця навукі.

Рабочая група не толькі акумулявала праблемы ў дзейнасці НАН Беларусі, але і выпрацавала прапановы па іх вырашэнні. Васіль Герасімаў іх агучыў. У далейшым яны будуць разгледжаны на сходзе ў Акадэміі навук, які даручыў падрыхтаваць Прэзідэнт. І там жа з дапамогай калектыўнага розуму і будуць вызначаны канчатковыя шляхі вырашэння праблемных пытанняў. Прэзідэнт настойвае, што абмяркоўваць гэтыя пытанні трэба не тайна, не кулуарна, а адкрыта разам з усімі зацікаўленымі.

**Першая прапанова рабочай групы** — вынесці на зацвярджэнне кіраўніка дзяржавы пералік прыярытэтных напрамкаў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, на падставе якіх на наступную пяцігодку будуць фарміравацца дзяржаўныя праграмы навуковых даследаванняў і навукова-тэхнічныя праграмы. Адпаведны праект указа пасля дапрацоўкі будзе ўнесены ўрадам на разгляд кіраўніка дзяржавы. «Гэты ўказ, стаўшы асновай навуковай і інавацыйнай дзейнасці, дасць магчымасць забяспечыць улік навуковых прыярытэтаў пры фарміраванні галіновых стратэгій, праграм і інавацыйных праектаў», — растлумачыў Васіль Герасімаў.

**Другое** — прапануецца Савету Міністраў арганізаваць кантроль за наяўнасцю ў галіновых стратэгіях міністэрстваў навукова-тэхнічнага блока для адпаведнага навуковага напаўнення праграм навуковых даследаванняў і навукова-тэхнічных праграм.

**Трэцяе.** Прапануецца ўнесці змены ў дзейны парадак фарміравання праграм навуковых даследаванняў, маецца на ўвазе фундаментальных. Вызначыць крытэрый эфектыўнасці праграм навуковых даследаванняў, параметры якіх зацвярджаць пры іх фармаванні на пяцігодку. Напрыклад, працэнт пераходу фундаментальных навуковых даследаванняў у навукова-тэхнічныя праграмы. «Гэта створыць аснову для забеспячэння трансферу акадэмічных распрацовак у вытворчасць», — адзначыў Васіль Герасімаў. У гэтым жа блоку — прапановы па змяненні падыходаў да фінансавання навукова-тэхнічных праграм, вызначыўшы іх заказчыкамі галіновыя міністэрствы. «Акадэмія застанецца заказчыкам толькі ў сваіх сферах па статуце. Напрыклад, нана- і біятэхналогіі, космас і іншыя. Ці можа ініцыіраваць тэмы перад міністэрствамі. У такіх умовах акадэмікам давядзецца зацікавіць канкрэтнага галіновага міністра ў сваёй распрацоўцы, якія спачатку добра падумае і пралічыць, як ён будзе ўкараняць яе ў вытворчасць і які

### У тэму

## МЫ ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ ТАК, КАБ НАВУКА БЫЛА РЭАЛЬНЫМ ДРАЙВЕРАМ РАЗВІЦЦЯ ЭКАНОМІКІ

**Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі, акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ** расказаў журналістам, што, дзякуючы шырокаму складу ўдзельнікаў, размова аб праблемах навуковай сферы краіны ў цэлым і Акадэміі навук у прыватнасці была шматбаковай. «У нас ёсць бясспрэчныя вынікі, распрацоўкі, укараненні. Але ёсць, вядома, і недахопы», — адзначыў ён. Адным з недахопаў НАН застаецца маштабаванне распрацовак. Па словах Уладзіміра Гусакова, неабходна больш шырокае іх укараненне, больш цесная сувязь навукі з галінамі эканомікі. Гэты тэзіс неаднаразова гучаў і на сустрэчы. «Усё, аб чым гаварылася на сустрэчы ў кіраўніка дзяржавы, мы ў аператыўным плане гатовы прааналізаваць і зможам укараніць і ў навуку, і ў практыку. Мы працуем цяпер над новым комплексам праграм нашых даследаванняў на будучую пяцігодку, адпрацаваны прыярытэты навукі, навукова-тэхнічнай дзейнасці. У рамках гэтых прыярытэтаў фарміруецца цэлы комплекс праграм навуковых даследаванняў, якія павінны пераходзіць у распрацоўкі, на іх базе павінны ствараецца адпаведныя вытворчасці, якія працуюць на эканоміку краіны, што павышаюць яе канкурэнтаздольнасць. Гэтыя пытанні вельмі надзённыя, актуальныя, неабходныя. Мы гатовы іх вырашаць», — падкрэсліў Уладзімір Гусакоў.

Сваімі меркаваннямі наконт удасканалення дзейнасці НАН Беларусі з журналістамі падзяліліся і члены рабочай групы. **Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы, член-карэспандэнт НАН, доктар гістарычных навук, прафесар Ігар МАРЗАЛЮК** найважнейшым складнікам навуковай дзейнасці назваў высокакваліфікаваныя кадры. Па яго словах, без іх не будзе ні фундаментальнай, ні прыкладной навукі. Адна з прапаноў Ігара Марзалюка, якую ён агучыў на сустрэчы з Прэзідэнтам, — заключэнне «эфектыўных кантрактаў». «Мы павінны стварыць рэальную дыферэнцыяцыю. Што называецца, «кожнай сястрыцы па завушніцы» ў залежнасці ад таго, наколькі «сястрыца» добра працуе. У нас на сёння, будзем шчырыя, ураўнілаўка. Яе не павінна быць, тым больш калі размова ідзе пра маладых перспектыўных вучоных», — падкрэсліў ён. Ігар Марзалюк перакананы, што патрэбны эфектыўны кантракт, дакладныя аб'ектыўныя крытэрыі эфектыўнасці работы ўсіх: пачынаючы ад малодшага навуковага супрацоўніка і заканчваючы дырэктарам інстытута. «Эфектыўна працуеш па празрыстых крытэрыях — атрымліваць павінен больш, чым іншы супрацоўнік, які працуе менш эфектыўна. Інтэлектуальную канкурэнцыю ніхто не адмяняў. Гэта вельмі важны момант», — растлумачыў ён. Ігар Марзалюк таксама звярнуў увагу, што ў асобных інстытутах НАН недастатковая колькасць спецыялістаў з навуковымі ступенямі. Напрыклад, у інстытутах гуманітарнай накіраванасці колькасць такіх спецыялістаў вагаецца ад 19 да 50 працэнтаў. Па словах эксперта, няправільна, калі акадэмічным інстытутам кіруе кандыдат навук, які не здольны або не жадае абараніць доктарскую дысертацыю. У сувязі з гэтым Ігар Марзалюк прапануе зняць якія-небудзь абмежаванні на занятак прафесійнай дзейнасцю для магістрантаў, аспірантаў і дактарантаў на вочнай форме навучання. Таксама, па словах члена рабочай групы, неабходна аднавіць страчаную традыцыйную звязку паміж «вузаўскай» навукай і акадэмічнай. Па словах Ігара Марзалюка, гэтыя тэмы неабходна абмяркоўваць на акадэмічным сходзе ў НАН, які анансаваў Прэзідэнт. «Мы хочам прынцыпова сумленна пагаварыць, — сказаў дэпутат. — Вочы ў вочы, не хаваючы праблем. Самае галоўнае: мы павінны зразумець, што няма нацыянальнай бяспекі без навукі. Мы павінны зрабіць так, каб навука стала рэальным драйверам развіцця эканомікі».

**Старшыня Рэспубліканскага савета рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі, рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Вадзім БОГУШ** ключавой задачай назваў камерцыялізацыю фундаментальнай навукі, пераход ад лабараторных узораў да масавай вытворчасці. Ён таксама падкрэсліў, што галіновыя міністэрствы павінны адыгрываць больш актыўную ролю і выступаць заказчыкамі правядзення навуковых даследаванняў. «Гэта не заказ і не купля нейкіх тэхналогій — гэта сумесная работа разам з вучонымі, каб нашы тэхналогіі нараджаліся, развіваліся і былі рэалізаваны на практыцы», — сказаў Вадзім Богуш.

**Намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі Сяргей КРАСНЫ** адзначыў, што айчынная медыцынская навука развіваецца інтэнсіўна. Але праблем хапае. І адна з іх — слабое ўзаемадзеянне акадэмічнай, галіновай і «вузаўскай» навукі. «Чамусьці кожны бачыць у іншым канкурэнта. А практыка паказвае, што, калі мы змаглі аб'яднаць намаганні вучоных рознай накіраванасці, то атрымліваюцца найбольш значныя прарыўныя тэхналогіі», — падкрэсліў вучоны.

эфект у выніку атрымаецца. Гэта ўзмоцніць адказнасць за якаснае напаўненне праграм, арыентаваных на вынік», — заявіў Васіль Герасімаў.

Таксама прапануецца вызначыць незалежны дзяржаўны орган, які будзе ацэньваць прапанаваныя акадэміяй і міністэрствамі праграмы на адпаведнасць стратэгічным мэтам развіцця галін і дзяржавы. Васіль Герасімаў падкрэсліў, што гэту ролю на сябе можа ўзяць і ДКНТ, але для гэтага неабходна трансфармаваць работу ведамства, узмацніць яго ролю і адказнасць. Сярод прапаноў рабочай групы — прадугледзець удзел маладых вучоных у навуковых калектывах, што будзе садзейнічаць уключэнню моладзі ў навуку.

### Грошы будуць, калі будзе вынік

Прэзідэнт прапанаваў усім прысутным выказаць сваё меркаванне. Намеснік старшыні Усебеларускага народнага сходу, член рабочай групы Аляксандр Косінец заўважыў, што ў краіне фактычна не прапічваюць навукаёмістасць валавога ўнутранага прадукту. Сумы, якія выдзяляюцца з рэспубліканскага бюджэту на навуковую дзейнасць, кожны год розныя, і розніца значная. Аляксандр Косінец падкрэсліў, што павінен быць дакладна сплановваны, спрагназаваны фінансавы інструмент суправаджэння навукі. Па яго словах, асаблівую ўвагу трэба ўдзяляць матывацыі навуковых кадраў. І адзін са спосабаў — заработная плата. Аляксандр Косінец адзначыў, што заработная плата прафесарска-выкладчыцкага складу павінна быць не ніжэйшай, чым у шахцёраў. «Яны павінны думаць толькі пра навуку», — падкрэсліў ён. Аляксандр Косінец заўважыў, што неабходна перагледзець і павысіць крытэрыі выбрання членаў і членаў-карэспандэнтаў НАН.

«Давайце без агітацый. Казаць аб тым, што членкарам і шахцёрам трэба зарплата роўная — гэта са сферы папулізму. Вы не назвалі ніводнай крыніцы. Забяром у шахцёраў грошы і аддадзім навукоўцам? Хацелася б, каб былі прапановы, дзе ўзяць. Вось гэта будзе важна», — адказаў на гэта Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Аляксандра Косінца, Нацыянальнай акадэміі навук варта засяродзіцца на экспертнай дзейнасці і стаць своеасаблівым дарадцам, калі, напрыклад, на тыя ці іншыя прадпрыемствы закупляюцца замежныя тэхналогіі. У сферах атамнай энергетыкі, біяіндустрыі або нафтахімічнага комплексу. Па словах Аляксандра Косінца, навуковы падыход да падбору магутнасцяў, закупак абсталявання дапаможа сэканоміць вялікія грошы, якія ў тым ліку можна будзе выдаткаваць і на зарплату навукоўцаў.

«Можа быць, у нас сапраўды дактары і акадэмікі, кандыдаты атрымліваюць не тую заработную плату, трэба ім павялічыць яе ў пяць разоў (не ведаем толькі, дзе грошы знайсці). Мы зыходзілі з таго, што павінен быць вынік. І за вынік ні ў якім разе нельга шкадаваць грошай», — адзначыў Прэзідэнт. У прыклад ён прывёў распрацоўку беспілотнікаў. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, вучоныя мала ўдзяляюць увагі гэтаму кірунку, а ён сёння важны, як ніколі раней. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэта заўвага не толькі ў адрас НАН, але і ўрада.

«Справа не ў заробках. У нас што, усе на акладах будуць сядзець? Па 8—10 тысяч мы будзем дактарам і кандыдатам плаціць, і ўсё добра? А за што плаціць? І потым. Вы што, не разумееце, як у нас абараняюць доктарскія і кандыдацкія? Пры тым цвёрдым кантролі, які сёння ажыццяўляецца з боку Прэзідэнта. І потым вы кажаце: трэба плаціць, як шахцёру. Шахцёр накапаў і на-гара падняў — можна палічыць. А тут, калі плаціць па вашым раскладзе, ні дактары, ні кандыдаты нічога не будуць рабіць напалову, — пераканаы беларускі лідар. — Я не супраць таго, каб людзі атрымлівалі, але грошы павінны быць зароблены». Прэзідэнт заявіў, што Акадэмію навук у Беларусі захавалі для таго, каб яна давала вынік. «Таму перш чым уносіць прапановы аб заробках (непапулярна перад выбарамі сказана, але ніколі папулізмам не займаўся), называйце крыніцу, дзе возьмем. Мы не пашкадуем грошай, калі будзе вынік», — паабяцаў кіраўнік дзяржавы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Міжпарламенцкі дыялог

# Збліжэнне заканадаўства і патрыятычнае выхаванне

## Саюзныя дэпутаты падвялі вынікі сумеснай работы і абмеркавалі перспектывы дзейнасці па інтэграцыі Беларусі і Расіі

**З нагоды 25-годдзя падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы ў Нацыянальным прэс-цэнтры адбыўся відэамост Масква — Мінск, арганізаваны дэпутатамі Парламенцкага сходу. Саюзныя парламентарыі абмеркавалі актуальныя кірункі дзейнасці па будаўніцтве Саюзнай дзяржавы, яе месца ў міжнародных адносінах, асаблівую ўвагу ўдзялілі парламенцкай дзейнасці па інтэграцыі Беларусі і Расіі. Акрамя таго, былі разгледжаны пытанні развіцця паўнамоцтваў Парламенцкага сходу, збліжэння заканадаўства дзвюх краін, міжрэгіянальнага і прыгранічнага супрацоўніцтва, экалагічнага парадку дня, дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, патрыятычнага выхавання моладзі, забеспячэння ваеннай бяспекі і абароны Саюзнай дзяржавы.**

### «ЛАКАМАТЫЎ РУХУ НАПЕРАД»

Як адзначыў **старшыня Камісіі Парламенцкага сходу па міжнародных справах, міграцыйнай палітыцы і сувязях з суайчыннікамі, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Сяргей РАЧКОЎ**, Саюзная дзяржава — гэта не толькі ўнутрыпалітычны праект Беларусі і Расіі. «Ён таксама выконвае вельмі важную знешнепалітычную функцыю і з'яўляецца ўнікальным з пункту гледжання міжнароднага права і міжнародных адносін, — удакладніў парламентарый. — Сёння Саюзная дзяржава заўважная на міжнароднай арэне, удзельнічае ў фарміраванні новага сусветнага парадку, пабудове шматпалярнага свету».

Па словах Сяргея Рачкова, Саюзная дзяржава дазволіла Беларусі і Расіі яшчэ больш аб'яднацца і супрацьстаяць незаконнаму санкцыйнаму ціску з боку краін Захаду. «Дзякуючы гэтаму яднанню мы здолелі вырашыць вельмі многія эканамічныя задачы, тавараабарот паміж нашымі краінамі значна павялічыўся, працягваюць вельмі актыўна развівацца сферы паслуг і інвестыцыйнага супрацоўніцтва, — канкрэтызаваў дэпутат. — Фактычна Саюзная дзяржава становіцца пэўнай альтэрнатывай заходнім інтэграцыйным мадэлям».

Сяргей Рачкоў звярнуў увагу на тое, што інтэграцыйныя працэсы паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй ідуць вельмі актыўна, дынамічна і рэзультатыўна. «Калі яшчэ раз зазірнуць у 1999 год, то мы адзначым, наколькі час быў няпросты пасля спынення дзейнасці Савецкага Саюза, — нагадаў ён. — І дзве суверэнныя і незалежныя дзяржавы — Беларусь і Расія — вырашылі рушыць наперад на шляху інтэграцыйных працэсаў і падпісаць саюзны дагавор. Гэта дзіўны дакумент, які сёння, вядома, патрабуе не проста прадаўжэння работы і рэалізацыі, але і аналізу са знешнепалітычнага пункту гледжання. Бо пры падпісанні быў створаны Вышэйшы дзяржаўны савет Саюзнай дзяржавы, Савет Міністраў, Парламенцкі сход. Нам трэба будзе яшчэ стварыць іншыя органы, якія будуць развіваць працэсы інтэграцыі паміж дзвюма дзяржавамі».

Парламентарый падкрэсліў, што за 25 гадоў краіны дабіліся сур'ёзных вынікаў. «Перш за ўсё ў чалавечым вымярэнні, — адзначыў Сяргей Рачкоў. — Сёння грамадзяне Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі маюць аднолькавыя правы, магчымасць жыць і працаваць як у Беларусі, так і ў Расіі, паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы, атрымліваць адукацыю. Вельмі шмат дасягнута ў міжнародным пазіцыянаванні Саюзнай дзяржавы. Яна з'яўляецца прыкладам, а можа быць, і лакаматывам руху наперад у такіх аб'яднаннях, як СНД і ЕАЭС. Дзякуючы праграме сумесных дзеянняў у знешняй палітыцы, мы сёння пазіцыянуем Саюзную дзяржаву ў ААН і на іншых міжнародных пляцоўках, уключаючы парламенцкія. Таму мы падыходзім да юбілею з вельмі сур'ёзнымі вынікамі, але адназначна скажу, што наперадзе будзе выключна вялікая работа, каб у поўным аб'ёме рэалізаваць саюзны дагавор».

### МАГУТНЫ СТЫМУЛ УЗАЕМАДЗЕЯННЯ

У развіцці адносін у рамках Саюзнай дзяржавы, па словах **старшыні Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па прамысловасці і гандлі Сяргея МІЦІНА,** важнае значэнне мае Форум рэгіёнаў дзвюх краін. «Узаемаадносіны Беларусі і Расіі на ўзроўні рэгіёнаў стымулююць эканамічныя ўзаемаадносіны ў Саюзнай дзяржаве, — канкрэтызаваў парламентарый. — Форум рэгіёнаў — гэта грандыёзнае мерапрыемства. Кожны форум дае новы штуршок тым магчымасцям, якія мае кожны суб'ект і Беларусі, і Расіі. У бягучым годзе мы даведаліся пра Віцебскую вобласць як вельмі магутнага гульца і ў сферы сельскай гаспадаркі, і ў сферы ветэрынарыі, вытворчасці ветэрынарных прэпаратаў, машынабудаванні. На мой погляд, форум — магутны стымул узаемадзеяння».

Сяргей Міцін падзяліўся прыкладам, калі ўзаемадзеянне на ўзроўні рэгіёнаў Беларусі і Расіі дае магчымасць рэалізоўваць маштабныя краінавыя праекты. «Цяпер развіваецца найважнейшая сусветная транспартная структура — Паўночны марскі шлях, — канстатаваў дэпутат. — І было прыемна даведацца, што беларускі бок у Мурманску будуе партовую інфраструктуру. Там недахоп інфраструктуры, вельмі добра нашы беларускія калегі сарыентаваліся. І ў выніку Далёкі Усход прамой ніткай звяжацца з Беларуссю. Гэта вельмі добры прыклад, як рэгіёны могуць свае магчымасці прадставіць».

### АДКРЫТЫ ЎРОК І МАЛАДЗЁЖНЫ ХОР

Як паведамілі падчас відэамоста, ва ўстановах адукацыі з 5 да 10 снежня пройдзе адзіны ўрок «Саюзная дзяржава. 25 гадоў разам», прысвечаны 25-годдзю падпісання Дагавора паміж Расійскай Федэрацыяй і Беларуссю «Аб стварэнні Саюзнай дзяржавы». Урок закліканы дапамагчы навучэнцам сфарміраваць уяўленне аб гісторыі Саюзнай дзяржавы, усвядоміць каштоўнасці дружбы паміж народамі Беларусі і Расіі, выхоўваць павагу да традыцый.

Акрамя таго, у Саюзнай дзяржаве плануецца стварыць Маладзёжны хор. У свой час па ініцыятыве Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па культуры, навуцы і адукацыі быў створаны маладзёжны сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам Юрыя Башмета.

«Мы прапанавалі па аналагу стварыць маладзёжны хор Саюзнай дзяржавы пад кіраўніцтвам дырыжора Георгія Сафонава, — распавёў **старшыня Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па культуры, навуцы і адукацыі Мікалай БУРЛЯЕЎ.** — Беларусы адбяруць для яго 20 сваіх маладых спевакоў, а нашы — 30 кансерваторцаў і выпускнікоў вучылішча імя Гнесіных. Будуць сабраны найлепшыя маладыя людзі, якія будуць выконваць абсалютна ўсё: і беларускія, і рускія песні, і Моцарта, і Баха, і Рахманінава».

Па словах парламентарыя, камісія прапанавала ідэю стварэння фільма аб прападобным Сергіі Раданежскім. «Акрамя таго, мы прапанавалі 30 міні-фільмаў да трох хвілін, ад сілы пяць хвілін, аб героях-падзвіжніках Беларусі, — дадаў Мікалай Бурляеў. — Пятнаццаць імён мы «ўваскрэсім» і пакажам у гэтых фільмах для моладзі, а таксама 15 найбуйнейшых расійскіх дзеячаў, гістарычна прызнаных. Тым самым у хуткім часе мы пакажам звар'ацеламу свету, што можна жыць, як мы жывём, руські і беларусы. Што можна ўратаваць душу, можна жыць, абапіраючыся на традыцыйныя духоўна-маральныя каштоўнасці».

Мікалай Бурляеў звярнуў увагу, што за час існавання камісіі зроблена вельмі шмат. «Мы працуем у абсалютным духоўным яднанні, і ў нас няма нейкіх супярэчнасцяў, — адзначыў ён. — У нас адна мэта: мы разумеем, што культура і культурная спадчына — гэта аснова ўсяго».

**Паводле БелТА.**

Пазіцыя

# «Нашы правы нельга парушаць беспакарана»

## «Беларуськалій» у судзе супраць Літвы

**ААТ «Беларуськалій» 2 снежня пададзена поўная іскавая заява ў рамках міжнароднага інвестыцыйнага арбітражу супраць Літвы ў сувязі з яе незаконнымі дзеяннямі, у выніку якіх былі парушаны правы кампаніі як замежнага інвестара, абароненыя пагадненнем паміж урадамі дзвюх краін аб заахвочванні і абароне інвестыцый. Генеральны дырэктар ААТ «Беларуськалій» Андрэй Рыбакоў у гутарцы з карэспандэнтам БелТА пракаментаваў гэта рашэнне беларускага боку.**

Літва ў пачатку 2022 года спыніла транзіт беларускіх калійных угнаенняў і ў аднабаковым парадку скасавала дагавор аб перавозцы грузаў з Беларуссю. Акрамя таго, былі парушаны правы беларускага боку як інвестара ў інфраструктуру порта Клайпеда. «Беларуськалій» абараняе свае правы ў міжнародным арбітражы.

«Мы цяпер працуем у спакойным рэжыме, перафарматавалі нашу лагістыку і выходзім на міжнародны рынак з пастаўкамі калійных угнаенняў у неабходным аб'ёме. Гэта іскавая заява не з'яўляецца аўральнай, у нас няма форс-мажору. Гэта халоднае, абдуманае рашэнне па прыцягненні да адказнасці за беспрэцэдэнтнае парушэнне нашых правоў. Адпрацаваўшы некалькі гадоў у новым фармаце, выбудаваўшы новыя механізмы і лагістычныя рашэнні, мы больш дакладна ацанілі нанесены нам урон. І мы выстаўляем у гэтым іску ўсе нашы прэтэнзіі з халодным разлікам для таго, каб дабіцца ад адказчыка поўнага кампенсавання гэтых затрат», — сказаў Андрэй Рыбакоў.

Паводле яго слоў, іскавая заява комплексная, шматфактарная. «Яна падрыхтавана прафесійнымі юрыстамі з нашым удзелам. Іскавая заява аддадзена на вывучэнне зацікаўленым бакам», — адзначыў генеральны дырэктар ААТ «Беларуськалій».

Ён таксама растлумачыў, якія асноўныя мэты беларускага боку пры падачы іску. «Ні ў каго не павінна стварацца ўражанне, што нашы правы можна парушаць беспакарана. На такія дзеянні заўсёды будзе адказ нашай краіны. Гэта пасыл для тых, хто будзе спрабаваць парушаць нашы правы ў будучыні. Акрамя таго, мы хочам дабіцца кампенсацыі ўрону. Сума вельмі значная, яна будзе аналізавацца ўсімі бакамі і падчас працэсу будзе абмяркоўвацца і ўзважвацца. У заяве прыведзены ўсе неабходныя разлікі, усё дакладна і зразумела, на наш погляд. Канчатковае рашэнне за арбітражам», — сказаў на заканчэнне Андрэй Рыбакоў.

З нагоды

# БРЭСТЧЫНА НАСТРОЕНА НА РЫВОК

**Сёння, 4 снежня Брэсцкая вобласць адзначае 85-ю гадавіну з дня ўтварэння. Гэтаму юбілею была прысвечаная прэс-канферэнцыя кіраўніка Брэстчыны Пятра ПАРХОМЧЫКА. Гаворка ішла пра развіццё прамысловасці і сельскай гаспадаркі, сацыяльную сферу; былі абазначаны асноўныя пункты росту.**



## ПАТРЭБНЫ НАВАТАРСКІЯ ІДЭІ

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр Пархомчык правёў першую на сваёй цяперашняй пасадзе прэс-канферэнцыю для рэгіянальных і рэспубліканскіх СМІ. Журналісты адразу ж заўважылі, што сустрэча праходзіць у час, калі губернатар адпрацаваў сімвалічныя сто дзён. Таму шмат пытанняў датычылася яго асабістага знаёмства з рэгіёнам і ўспрымання Брэстчыны.

Кіраўнік вобласці згадаў выказванне аднаго са сваіх папярэднікаў Канстанціна Сумара, які аднойчы назваў жыхароў рэгіёна беларусамі са знакам якасці. «Цяпер я зразумеў сэнс гэтых слоў. Сапраўды, тут жывуць людзі, якія ўмеюць працаваць і многага дасягнулі, — сказаў Пётр Пархомчык. — І вось, атрымаўшы гэтую пасаду, я разумею, што нельга дапусціць падзення вытворчасці, вынікаў работы нашых сельгаспрадпрыемстваў, трэба захаваць станоўчую дынаміку развіцця прамысловасці ды іншых галін. Магу сказаць, што атрымліваецца. Выконваем, і нават крыху больш, чым планавалі. Не выконваецца толькі паказчык па інвестыцыях, не ўсе асвоілі тыя грошы, што былі выдзеленыя на рэалізацыю асобных інвестпраектаў. Ёсць шэраг прадпрыемстваў, якім не хапае рыўка, наватарскіх ідэй, каб прыбавіць у аб'ёмах».

І працягнуў разважанні на гэтую тэму:

— Галоўная задача кіраўніка — захацець здзейсніць прарыў і заразіць такім жаданнем найбліжэйшы круг аднадумцаў-калег. Тады справа зрушыцца з месца. Я ніколі не мірыўся з гэтымі памяркоўнымі лічбамі — 102-103 працэнты. А чаму, напрыклад, не 115? Гэта ж дабрабыт прадпрыемства і магчымасці яго развіцця, гэта заробтная плата калектыву. Важна не спыніцца на тым, чаго дасягнулі, а ісці наперад. Калі ў людзей гараць вочы, калі яны любяць сваю работу, у іх усё атрымліваецца.

## АД ХАЛАДЗІЛЬНІКАЎ ДА САМАЛЁТАЎ

Супрацоўнікі СМІ нагадалі губернатару, што пры яго прызначэнні кіраўнік дзяржавы паставіў задачу звярнуць асаблівую ўвагу на прамысловасць. Пётр Пархомчык расказаў пра распрацоўку Праграмы развіцця аграпрамысловага комплексу Брэсцкай вобласці. Праграма накіраваная на паскораны рост і павелічэнне долі машынабудаўнічых галін, у тым ліку на павелічэнне ўдзельнай вагі прамысловага комплексу ў валавым рэгіянальным прадукце.

Будуць рэалізаваны вялікія праекты, якія закліканы даць імпульс развіццю. Напрыклад, плануецца будаўніцтва новага завода па вытворчасці ДСП на прадпрыемстве «Івацэвічдрэў» магутнасцю 600 тысяч кубаметраў, што дазволіць павялічыць выпуск такой прадукцыі ў 2,5 раза; будаўніцтва новых магутнасцяў для выпуску акумулятараў і камплектавальных да іх у Пінску. Ну і, вядома, атрымае далейшае развіццё флагман рэгіянальнай індустрыі — харчовая і перапрацоўчая прамысловасць.

У Баранавічах хутка будзе рэалізавана некалькі значных інвестыцыйных праектаў. Ужо фактычна завершана падрыхтоўка пляцоўкі для арганізацыі вытворчасці халадзільнага абсталявання кампаніі «Мідэа». Першыя кантэйнеры з прадукцыяй ужо дастаўлены ў горад, вядзецца іх разгрузка, іншыя — у дарозе. Да канца года на прадпрыемстве спадзяюцца атрымаць усе станкі і ўсе тэхналогіі для вытворчасці новых халадзільнікаў. На гэтай вытворчасці будуць прыменены тэхналогіі на ўзроўні сусветных. «Калі ўсё будзе ісці ў адпаведнасці з планам, то да канца года выпусцім першую партыю халадзільнікаў», — адзначыў кіраўнік вобласці.

Дарэчы, зусім нядаўна на Баранавіцкім станкабудаўнічым заводзе ЗАТ «Атлант» запушчана вытворчасць першага ў Беларусі высокаэфектыўнага інвентарнага кампрэсара. Такім чынам будзе створаны мадэльны рад высокаэфектыўных кампрэсараў з паніжаным спажываннем электраэнергіі для выпуску халадзільнікаў. Тым часам прадпрыемства прапрацоўвае наступны праект. «Бачым неабходнасць вытворчасці высокатрывалага чыгуну. Трэба прамаштабаваць, павялічыць фактычна ў два разы аб'ёмы яго вытворчасці», — расказаў Пётр Пархомчык.

У Баранавічах неўзабаве павінен быць ажыццёўлены яшчэ адзін, даволі амбіцыйны, праект. Маецца на ўвазе вытворчасць у Беларусі самалётаў. Распрацоўка дакументацыі на 19-месны самалёт «Асвей» ідзе ў прапорцыі 50/50 з авіябудаўнічымі прадпрыемствамі Расіі. Такім чынам, гаворка ні многа ні мала — пра айчыннае авіябудаванне. «І ўжо ў 2026 годзе чакаецца выпрабаванне вопытнага ўзору самалёта, яго палёт», — удакладніў Пётр Пархомчык.

Асаблівая ўвага, паводле слоў кіраўніка вобласці, будзе аддавацца развіццю прадпрыемстваў, якія маюць пэўныя праблемы, у першую чаргу рэалізацыя на іх новых праектаў і асваенне новых відаў прадукцыі. А каб гэта ўдалося ажыццявіць, трэба прадугледзець рост узроўню аплаты працы як галоўнай умовы прыцягнення кадраў.

## БУДУЧЫНЯ — ЗА ЭЛЕКТРАДАМАМІ, «РАЗУМНЫМІ» ДАМАМІ

Падрабязна гаварылі ў гэты дзень пра вынікі года і развіццё сельскай гаспадаркі, а таксама пра будаўніцтва, развіццё электратранспарту, увядзенне ў эксплуатацыю электрадамоў і «разумных» дамоў. Губернатар адзначыў, між іншым, што Брэсцкая вобласць займае лідзіруючыя пазіцыі па колькасці легкавога аўтатранспарту, расце і колькасць электракараў на дарогах. Сёння ў вобласці 82 электразарадныя станцыі, колькасць іх будзе расці, гэты кірунак кіраўніцтва вобласці мае намер развіваць. У Брэсцкай вобласці таксама рэалізуюць праграму будаўніцтва жылля з выкарыстаннем электрычнай энергіі для ацяплення, водазабеспячэння і гатавання ежы. Летась узвялі 78 783 квадратныя метры такога жылля, маюцца на ўвазе як шматпавярховікі, так і індывідуальныя дамы. Праграма будзе развівацца далей. Зараз асабліва запатрабаваныя «разумныя» дамы, якія прадугледжваюць беражлівае стаўленне да рэсурсаў. У гэтым кантэксце губернатар згадаў і новы праект, які толькі на стадыі перамоў. Цяпер завяршаецца перагаворны працэс аб стварэнні ўздоўж ракі Мухавец цэлага мікрараёна з «разумным» жыллём, бізнес-цэнтрамі, інфраструктурай. Гэта будзе прынцыпова новы для Брэста ўзор будаўніцтва: «У найбліжэйшыя 15-20 гадоў абласны цэнтр атрымае прыгожы, суперсучасны мікрараён».

## НЕ КОЛЬКАСЦЬ, А ЯКАСЦЬ

Для развіцця глыбінкі падкрэслівалася важнасць рэалізацыі праграмы «Адзін раён — адзін праект». Губернатар адзначыў, што праграма не абмяжоўваецца рэалізацыяй у бягучай пяцігодцы толькі аднаго праекта ў кожным з раёнаў. Цяпер у 16 раёнах і трох гарадах вобласці ажыццяўляецца рэалізацыя 31 інвестыцыйнага праекта. Гэта новыя вытворчасці, прыліў інвестыцый, новыя рабочыя месцы ў рэгіёнах. Паводле яго слоў, важна засяродзіцца не на колькаснай складовай, а на якасці. Няма добрых ідэй, і па гэтай прычыне прабуксоўвае праграма «Адзін раён — адзін праект». «Замест таго каб думаць над новым, мы любім паўтараць адзін за адным. Быў час, калі сталі адкрываць прадпрыемствы па выпуску драўляных пелет. Цяпер узніклі праблемы з іх рэалізацыяй. І многія не ведаюць, куды падзець прадукцыю. У гэтым сэнсе не грэх прыглядзецца да вопыту асобных прыватных вытворцаў. Ёсць прыватныя кампаніі, якія зарэкамендавалі сябе вельмі ўмелымі вытворцамі, выдатнымі менеджарамі, яны заслугоўваюць усялякай пашаны».

## ЗАДАЧЫ ДЛЯ ПЕРШАГА РЭГІЁНА

Так, асноўны час канферэнцыі прысвяцілі размове аб развіцці прамысловасці, але не абышлі ўвагай і сацыяльную сферу. «Гэтыя пытанні такія ж надзённыя, як вытворчыя праблемы, — сказаў Пётр Пархомчык. — Усё ўзаемазвязана: будзем лепш працаваць, больш зарабляць, адпаведна больш грошай накіроўваць на сацыяльныя патрэбы. Фінансаванне адукацыі, аховы здароўя, культуры на 2025 год запланавана з плюсам. Значная частка грошай, як і ў папярэднія гады, накіроўваецца на будаўніцтва, рамонт, мадэрнізацыю ўстаноў аховы здароўя. Налета запланавана завяршыць рамонт у Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы, Пінскай дзіцячай паліклініцы, бальніцы Давыд-Гарадка. Маштабная рэканструкцыя працягваецца ў Пінскай цэнтральнай бальніцы, завяршыць яе плануецца ў 2026 годзе. Вядзецца будаўніцтва новага корпуса Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы, распрацоўваецца праектная дакументацыя для рэканструкцыі Баранавіцкага радзільнага дома. Прадоўжыцца паступленне ва ўстановы аховы здароўя новага абсталявання. Будуць узводзіцца новыя дзіцячыя садкі і школы».

Згадалі і словазлучэнне «першы рэгіён», якое стала ўжо брэндам. Як вядома, Брэсцкая вобласць першая па алфавіце, адпаведна і называецца першым рэгіёнам. Дарэчы, ёсць нямала паказчыкаў, па якіх вобласць займае лідарскія пазіцыі ў краіне. «У вобласці ёсць паспяховыя прадпрыемствы, асабліва тыя, што займаюцца глыбокай перапрацоўкай сельгаспрадукцыі. На вышыні там і якасць, і маркетынг, і тэхналогіі, — сказаў губернатар. — Мы, як вядома, першыя ў краіне па малаку — і па надоях, і па вале. У нас вельмі высокі ўзровень лакалізацыі, то-бок глыбіня перапрацоўкі малака адна з найлепшых у Рэспубліцы Беларусь. Пералік можна працягваць. Адным словам, трымаць планку першага — гэта вялікая адказнасць, гэта і стымул для імкнення адпавядаць статусу».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота БелТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Нараджальнасць у ЕС знізілася да рэкорднага ўзроўню



Летась у краінах Еўрасаюза з'явіліся на свет 3 млн 655 тыс. дзяцей. Такія даныя еўрапейскай статыстычнай службы Еўрастат, паведаміла ТАСС. Гэты паказчык стаў найніжэйшым з пачатку збору адпаведнай інфармацыі ў 1961 годзе, піша Financial Times (FT). Як адзначае выданне, нізкая нараджальнасць у Еўропе павялічыць нагрузку на дзяржбюджэт, бо колькасць працаздольнага насельніцтва скарачаецца, а выдаткі на ахову здароўя і пенсійнае забеспячэнне павялічваюцца. Паводле даных Еўрастата, тэндэнцыя да памяншэння колькасці дзяцей найбольш яскрава праяўляецца ў краінах Балтыі, у Грэцыі, Іспаніі, Італіі, Польшчы і Фінляндыі, дзе за апошнія дзесяцігоддзе колькасць нараджэнняў скарацілася сама меней на чвэрць.

### У Кітаі заявілі, што долар шкодзіць глабальнай стабільнасці і парадку



ЗША выкарыстоўваюць долар як геапалітычны інструмент, заявіў афіцыйны прадстаўнік КНР у Вашынгтоне Лю Пэн'юй. Аб гэтым паведаміла газета «Известия». «ЗША ператварылі яго ў геапалітычны інструмент, які шкодзіць міжнароднай эканамічнай і фінансавай стабільнасці, а таксама падрывае міжнародны парадак», — адзначыў Лю Пэн'юй. Па словах дыпламата, амерыканскі ўрад распаўсюджвае сваю інфляцыю на іншыя краіны шляхам выкарыстання гегемоніі долара. Лю Пэн'юй адзначыў, што БРІКС у адрозненне ад ЗША прасоўвае больш справядлівую фінансавую сістэму. Напярэдадні прэс-сакратар Прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў заявіў, што долар страчвае для многіх краін сваю прывабнасць і Вашынгтон не зможа сваім ціскам перашкодзіць гэтаму працэсу.

### У Індыі ў выніку цыклону пацярпелі каля 15 мільёнаў чалавек



У выніку ўдару магутнага трапічнага цыклону «Фенгал» на поўдні Індыі пацярпелі каля 15 млн чалавек. Пра гэта заявіў галоўны міністр штата Тамілнад Мутхувел Сталін, паведаміла ТАСС. У выніку ўдару стыхіі па паўднёвым індыйскім штаце Тамілнад загінулі 12 чалавек. Трапічны цыклон, які суправаджаўся лівенямі і парывістым ветрам, таксама нанёс сур'ёзную шкоду інфраструктуры, знішчыў сельскагаспадарчыя ўгоддзі і парушыў паўсядзённае жыццё мільёнаў людзей. «Цыклон выклікаў беспрэцэдэнтныя разбурэнні ў 14 акругах Тамілнада», — заявіў міністр, адзначыўшы, што былі разбураны больш за тры тысячы жылых дамоў.




# «Гэта не толькі пра бізнес, але і пра чалавечыя адносіны»

### «У асноўным — гэта ціхі жах»

Цяпер увесь паток легкавых аўто вымушаны рухацца з Беларусі ў Польшчу праз адзіны пагранпераход Цярэспаль (Брэст). Вынік — велізныя чэргі з аўтобусаў і легкавушак і пакутлівае чаканне ўезду на сумежную тэрыторыю.



— Пасля закрыцця польскім бокам іншых аўтадарожных пасажырскіх пунктаў пропуску на шляху ў Еўрасаюз перад пагранпераходам Цярэспаль (з беларускага боку — Брэст) сфарміравалася так званае бутэлечнае рыльца, куды накіроўваецца ўсе, хто мае намер трапіць у Польшчу. У сувязі з гэтым збіраецца вялікая колькасць транспарту. Пікавыя значэнні чэргаў дасягалі 1700 легкавых транспартных сродкаў і 100 аўтобусаў, — расказвае **намеснік начальніка аддзялення пагранічнага кантролю «Варшаўскі мост» капітан Яўген КАРЭЙВА.**

Тут варта адзначыць, што кантрольныя службы польскага пагранпераходу Цярэспаль працуюць на мінімуме сваіх магчымасцяў. Прапускная здольнасць вызначана двухбаковымі дамоўленасцямі і разлічана на больш чым 70 аўтамабіляў за гадзіну. Зыходзячы са статыстыкі, якую Дзяржпагранкамітэт штодня публікуе ў сваіх каналах камунікацыі, польскі бок у сярэднім прымае на сваю тэрыторыю каля 20 машын за гадзіну, а гэта менш за 30 працэнтаў ад устаноўленай нормы.

— Раз на раз не прыходзіцца, але ў асноўным — гэта ціхі жах, — дзеліцца сваімі ўражаннямі мінчанін, які выязджае з Беларусі. — Ты прыязджаеш на граніцу з дзіцем або з сям'ёй, стаіш тут усю ноч, потым у Польшчу выязджаеш і проста ўжо няма сіл ехаць далей. Даводзіцца класціся спаць, бо небяспечна ў такім стане быць за рулём. Вядома, гэта ўсё дрэнна адбіваецца на простых людзях, і няважна, ездзяць яны па пакупкі ці на адпачынак — дрэнна ўсім аднолькава.

— Я лічу, што трэба хутчэй адкрываць усе польскія пункты пропуску. У кагосьці там сябры, сваякі, а ў кагосьці ў Беларусі, напрыклад, дзеці. Людзі банальна не могуць трапіць да сваіх блізкіх, — абураецца яшчэ адзін мужчына, які чакае сваёй чаргі.

***— У вас ёсць знаёмыя, якія перасталі ездзіць з-за таго, што цяпер працуе толькі адзін пункт пропуску?***

— Не, усе ездзяць, толькі праводзяць нашмат больш часу ў нудным чаканні ўезду ў Польшчу. Добра, што на беларускім баку ўвялі электронную чаргу перад пунктам пропуску. Цяпер можна адсочваць сваю пазіцыю ў чарзе анлайн на сайце і паехаць у Брэст, пагуляць па горадзе, зняць кватэру, адпачыць. Раней я прыязджаў, займаў месца і стаяў перад пунктам пропуску некалькі сутак, а потым і ўсярэдзіне яго яшчэ суткі. Такое не кожны вытрымае. Цяпер стала больш камфортна.

Гэта не першы чалавек, які за час нашага знаходжання ў пункце пропуску Брэст ацаніў эфектыўнасць новаўвядзення з электроннай чаргой. Згодна з новымі правіламі, пасля рэгістрацыі не трэба стаяць у чарзе. У зону чакання можна прыехаць, калі выклічуць у пункт пропуску з дапамогай тэлефоннага званка або паведамлення ў месенджары. Таксама чалавек можа сам адсочваць чаргу анлайн на сайце Белмытсэрвісу.

### «Альтэрнатывы ў перасячэнні граніцы няма»



У пустым пункце пропуску Дамачава нас сустрэў **начальнік аддзялення пагранкантролю падпалкоўнік Юрый ПІШЧЫК,** які расказаў пра сітуацыю, што склалася. Сумежны польскі пункт пропуску Славатычэ не функцыянуе з 2020 года, з таго моманту, як Польшча ўвяла абмежаванні, звязаныя з пандэміяй каранавіруса.

— Да прыпынення пропуску Польшчай штодзень у пункце пропуску Дамачава перасякалі граніцу да 4000 чалавек, да 1500 легкавых і да 100 грузавых транспартных сродкаў. Вось ужо чатыры гады закрыты іх пункт пропуску, хоць усе ковідныя абмежаванні зняты. На ратацыйнай аснове частка вайскоўцаў нашага падраздзялення была накіравана ў дзейныя пункты пропуску, дзе нагрузка на асабовы склад павялічылася.

Мы неаднаразова заклікалі і працягваем заклікаць польскі бок да аднаўлення пропуску праз граніцу, але, на жаль, нас не чуюць ці не хочуць чуць. У той жа час беларускі бок заўсёды гатовы да афармлення фізічных асоб і транспартных сродкаў, — падсумаваў афіцэр.



Ваеннаслужачая аддзялення пагранічнага кантролю «Дамачава» **старшы прапаршчык Святлана АМЯЛЯШЧЫК** расказала нам пра даковідныя часы і катэгорыі грамадзян, якія рухаліся праз пункт пропуску ў той час.

— У асноўным граніцу перасякалі мясцовыя жыхары з найбліжэйшых польскіх і беларускіх населеных пунктаў. Іншаземцы, якія не хацелі доўга стаяць у чэргах перад іншымі пагранпераходамі, прыязджалі да нас. Як правіла, у Дамачаве быў меншы пасажырапаток і знаходзілася менш транспарту. Цяпер жа ў падарожнікаў альтэрнатывы ў перасячэнні граніцы на беларуска-польскім напрамку няма — функцыянуе толькі адзін міжнародны аўтадарожны пункт пропуску Брэст (з польскага боку — Цярэспаль).

### «Скардзяцца і палякі, і нашы людзі»

Побач з пунктам пропуску Дамачава ёсць аднайменны гарадскі пасёлак. Мясцовыя жыхары за чатыры гады ўжо прывыклі да неабдуманага рашэння польскіх улад закрыць сумежны пункт пропуску, але ўсё ж спадзяюцца на лепшае.



— Некалькі слоў хацелася б сказаць аб кірунках міжнароднага супрацоўніцтва на ўзроўні нашага сельскага Савета і гміны Славатычэ, — пачынае **старшыня Дамачаўскага сельскага выканкама Анатоль СТРУК.** — У нас былі заключаны двухбаковыя дагаворы ў спорце, турызме, культурнай сферы, у прыгранічным супрацоўніцтве. Былі ідэі аб стварэнні сумесных вытворчасцяў, прадпрыемстваў. Адна з такіх ідэй — будаўніцтва невялікага завода па перапрацоўцы буякоў. У гэтым раёне шмат ягаднікаў. Людзі прафесійна займаюцца апрацоўкай буякоў, малін, іншых ягад.

Другі кірунак — стварэнне краязнаўчага музея. Мы пачалі збіраць розныя экспанаты, хацелі зрабіць сырзібу з мясцовай кухняй, якая складалася б са страў польскай, беларускай і галандскай. Дарэчы, тут, у Дамачаве, у XVI стагоддзі пасяліліся галандцы. Да гэтага часу па іх рэцэптах вараць сыры.

Яшчэ адзін кірунак, у якім польскі бок быў вельмі зацікаўлены, — мясцовы турызм. Да нас прыязджалі прадстаўнікі вялікай турыстычнай фірмы з Кракава, хацелі арганізоўваць сплаў па рацэ Буг і шмат іншага. Усё гэта засталося на стадыі распрацоўкі.

Пасля спынення пропуску праз граніцу ў сувязі з пандэміяй каранавіруса ў нас з польскім мясцовым кіраўніцтвам рэзка абарваліся сувязі, прычым па іх ініцыятыве. Яны проста перасталі адказваць на званкі, кантактаваць, тым самым замарозіліся ўсе нашы праекты. А яны былі добрыя, з доўгатэрміновай пазітыўнай перспектывай.

***— Людзі, якія раней часта ездзілі, цяпер працягваюць ездзіць? Ці большасць адмовілася?***

— Людзі, якія сёння не знайшлі работу тут, працягваюць ездзіць. Гэта адзінкі. Што дачыцца культурных сувязяў і прыватных, вядома, іх колькасць зменшылася. Скардзяцца і палякі, скардзяцца і нашы людзі. У нас жа шмат сувязяў на ўзроўні сем'яў. Нашы дзяўчаты ў Польшчу замуж выходзілі. Шмат палякаў, якія тут жывуць. І наадварот. А ўвогуле мясцовыя людзі кажуць: «Дамачава — партовы горад». Раней, у савецкія часы, на кожнае свята адкрывалася граніца і сюды аўтобусамі заязджалі турысты. На стадыёне праводзіліся ўрачыстасці ў вельмі цёплай добрасуседскай атмасферы.

У мясцовай краме нас сустрэла ўсмешлівая прадавец. Жанчына да гэтага працавала ў страхавой кампаніі ў пункце пропуску Дамачава.

— Я не сказала б, што маё жыццё неяк кардынальна памянялася пасля закрыцця граніцы. Выязджалі раней у Польшчу па тавары нейкія. Цяпер тут дастаткова разнастайны асартымент, усяго хапае. У перыяд, калі я працавала ў нашым пункце пропуску, шмат палякаў было, з імі кантактавалі. Яны расказвалі, што наведвалі сваякоў і турыстычныя мясціны, штогадовы фестываль. Цяпер, вядома, сумна, што такая сітуацыя.

Яшчэ адзін мясцовы жыхар падзяліўся сваёй думкай аб закрыцці сумежнага пункта пропуску і парушэнні сацыяльных сувязяў.

— У мяне шмат знаёмых у суседнім Славатычэ. Сустрэчы, сумесныя святы — гэта ўсё было часткай нашага жыцця. Цяпер толькі па тэлефоне кантактуем. Унучка мая замуж за паляка выйшла — раней часцей сустракаліся, цяпер значна радзей. Палякі ўвесь час ездзілі да нас па прадукты, тавары, хтосьці на рынак, хтосьці ў госці. Спадзяюся на хуткае адкрыццё граніцы. Гэта не толькі пра бізнес, але і пра чалавечыя адносіны. Важна, каб граніца не падзяляла нас, а аб'ядноўвала, — рэзюмаваў мужчына.

* * *

Сітуацыя на граніцы з Польшчай, абумоўленая аднабаковым закрыццём сумежнай краінай сваіх пунктаў пропуску, негатыўна адбіваецца як на падарожніках, так і на жыхарах прыгранічных раёнаў па абодва бакі. Доўгія чэргі і шматгадзіннае чаканне ўезду ў Польшчу перад адзіным пасажырскім пунктам пропуску Брэст не садзейнічаюць развіццю турызму, бізнесу і, банальна, сацыяльным сувязям.

Нягледзячы на недружалюбныя крокі польскіх улад, Беларусь працягвае дэманстраваць адкрытасць для замежнікаў, якія прыязджаюць да нас па «бязвізе». Дзякуючы новаўвядзенню грамадзяне многіх краін Еўропы маюць магчымасць наведваць Беларусь і бачыць наша жыццё на ўласныя вочы.

Разам з тым ключавым фактарам для нармалізацыі сітуацыі і ўзмацнення эканамічных і гуманітарных сувязяў паміж дзвюма краінамі з'яўляецца поўнае аднаўленне работы ўсіх пунктаў пропуску, да чаго мы неаднаразова заклікалі нашых суседзяў.

**Яўген ПЯЧОРЫН.**
**Фота Сяргея КАРЖЫЦКАГА.**
**Прэс-служба Дзяржпагранкамітэта.**




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ПРАДАЎЦЫ КВАТЭР ПАГАДЖАЮЦЦА НА ЗНІЖКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У другой палове апошняга месяца восені на сталічным рынку трохі павялічыўся выбар трохпакаёвых кватэр. Аднак агульная прапанова пачала павольна зніжацца. Пры гэтым на рынку іх выбар вырас толькі ў адным выпадку: колькасць трохпакаёвак узнялася на 1 %. А вось выбар самых запатрабаваных аднапакаёвых і двухпакаёвых кватэр скараціўся на 1,4 % і 1 % адпаведна. Пры гэтым у адной палове раёнаў прапанова вырасла — істотней за ўсё ў Першамайскім (плюс 2 %), а ў другой — знізілася, мацней за ўсё ў Маскоўскім раёне (мінус 4 %).

## ПАЧЫМ «КВАДРАТ»?

Сярод прадаўцоў, якія размясцілі свае аб'явы ў апошняй дэкадзе месяца, знізіліся цэны на 7 %, сярэдні памер зніжкі вар'іраваўся ад 1000 да 3700 долараў. У той жа час 1 % кватэр стаў даражэй — прыкладна на 1500—2000 долараў.

Пасля невялікай «прасадкі» ў сярэдзіне месяца сярэдняя цана квадратнага метра на другасным рынку жылля не змянілася і складае 1650 долараў за квадратны метр. Пры гэтым кошт «квадрата» ў гатовых дамах (ад забудоўшчыка і другаснага рынку) жылога комплексу «Мінск-Свет» за тыдзень знізіўся на 0,5 %.

У разрэзе колькасці пакояў мінімальны рост цэн назіраўся толькі ў двухпакаёвых кватэрах — плюс 0,2 %. Знізіўся кошт чатырохпакаёвых. Аднапакаёвыя і трохпакаёвыя кватэры ў цане не змяніліся.

Гаворачы аб цэнах на жыллё, спачатку трэба падзяліць яго на падгрупы. У першую мы аднясём кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў, а ў другую — гатовыя да пражывання (з рамонтам і мэбляй). Аднапакаёвыя стандартныя кватэры прадаюцца цяпер пачынаючы з 50 тысяч долараў, хоць бываюць і выключэнні. Напрыклад, у лістападзе была прададзена адна стандартная кватэра за 46 тысяч долараў (рамонт у ёй цалкам адсутнічаў рамонт). Двухпакаёвыя кватэры без аздабленняў ацэньваюцца цяпер у сярэднім у 70 тысяч долараў, але сустракаюцца і да пяці тысяч танней. Квадратны метр стандартнай трохпакаёўкі будзе самым танным (1250 долараў), а ў сярэднім яна прадаецца за 80 тысяч долараў.

Кватэры з разраду «бяры ключы і жыві» прадаюцца значна даражэй. Квадратны метр аднапакаёвай кватэры ацэньваўся ў лістападзе ў 1705 долараў, а цалкам апартаменты — у 65 тысяч долараў. Двухпакаёвая кватэра, гатовая да пражывання, ацэньваецца ў 90 тысяч долараў, а трохпакаёвая — у 105 тысяч долараў.

Вось якія цэны (тэндэнцыя за апошні тыдзень) былі ў абласных цэнтрах Беларусі. Квадратны метр жылля ў Брэсце працягвае расці з тэмпам 1,1 % і дасягнуў 1027 долараў за квадратны метр. Гродна плюсуе толькі 0,2 % (852 долары за квадратны метр), а Магілёў — 0,1 % (846 долараў). Віцебск ужо выйшаў на плато (771 долар), а Гомель пачаў рух уніз — мінус 0,2 % (798 долараў).

У буйных гарадах Мінскай вобласці сярэдні ўзровень цэн на кватэры вызначыўся на такіх адзнаках: Барысаў — 753 долары за квадратны метр (плюс 1,2 %), Салігорск — 788 долараў (мінус 0,3 %), Маладзечна — 876 долараў за «квадрат» (мінус 0,1 %).

## УДАЛЫ ГОД. ДЛЯ КАГО?

І сапраўды, да сярэдзіны лістапада рост цэн на кватэры не спыняў пакупніцкай актыўнасці. Спецыялісты называюць 2024-ы годам ажыятажу ў параўнанні з папярэднім, які, у сваю чаргу, таксама адзначаўся вялікімі продажамі і высокімі цэнамі.

Мяркуючы па папярэдніх даных Нацыянальнага кадастравага агенцтва, сёлета рынак нерухомасці паб'е рэкорды апошніх гадоў. Праўда, ужо цяпер эксперты бачаць перадумовы да таго, што ўдалы час для здзяйснення здзелак можа хутка скончыцца. На думку асобных спецыялістаў, цэны за «квадрат» ужо дасягнулі сваёй столі. Гэта пакажа нам час, а пакуль...

За студзень—верасень у сталіцы было заключана 14,8 тысячы здзелак куплі-продажу кватэр і дамоў. Калі параўноўваць з аналагічным перыядам мінулага года, гэта ўжо амаль на дзве тысячы прададзеных аб'ектаў больш. І такая тэндэнцыя назіраецца ў апошнія некалькі гадоў. Другаснае жыллё, мяркуючы па дадзеных здзелак, сёлета дадало ў кошце 12 %, а новабудоўлі — яшчэ больш. У такой сітуацыі, лічаць аналітыкі, прадаўцы прывыкаюць да таго, што можна максімізаваць цэны. І ў іх складваецца ўражанне, што так можа працягвацца заўсёды. Нешта падобнае мы назіралі ў 2012 —2013 гадах, калі цэны на кватэры падымаліся, але хутка ўсё скончылася. Эксперты лічаць, што пры ўсёй пазітыўнасці цяперашняй сітуацыі трэба быць гатовым, што ўсё гэтак жа рэзка можа змяніцца.

## ШТО З КРЭДЫТАМІ?

На продаж кватэр моцна ўплывае даступнасць крэдытавання. І тут ужо цяпер адбыліся змены: стаўка па крэдытах для куплі жылля паднялася да 16-17 % гадавых і нават вышэй. Гэта аказала ўплыў на пакупнікоў. Калі яшчэ тры месяцы таму доля пакупак жылля ў крэдыт, па даных асноўных агенцтваў нерухомасці, складала каля 40—45 %, то цяпер знізілася да 25—30 %, лічаць аналітыкі.

Паўплывалі і змены ў ільготным крэдытаванні. Сярод пакупнікоў найбольш папулярная праграма «Іпатэка Экспрэс» ад Беларусбанка. З нядаўніх часоў тыя, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, могуць узяць ільготны крэдыт толькі для куплі жылля па месцы рэгістрацыі, а не ў сталіцы. За кошт гэтага мінскі рынак жылля страціў каля 15—20 % іншагародніх пакупнікоў.

Калі стаўка па крэдытах працягне расці, гэта сур'ёзна адаб'ецца на рынку нерухомасці. Далёка хадзіць не трэба — усе яшчэ памятаюць прыклад 2021-га. Тады каля паўгода ўсе банкі наогул прыпынілі праграмы крэдытавання на куплю другаснага жылля. Дастаткова хутка крэдыты зноў сталі даступныя, але ўжо па стаўцы 22 % гадавых і вышэй. Тады доля пакупнікоў кватэр у крэдыт скарацілася да 4—6 %.

## АДКУЛЬ ЦЭНЫ?

У апошні час пакупнік усё часцей стаў прыглядацца да добраўпарадкаваных кватэр. Набываючы даражэйшую і дагледжаную кватэру ў крэдыт, людзі тым самым расцягваюць цану не толькі кватэры, але і рамонту ў ёй на тыя ж 20 гадоў. Так, цана рамонту закладзена ў цану «квадрата» і робіць яго даражэй прыкладна на 150 долараў, але ўвесь працэс расцягваецца ў часе. Гэта ў нейкім родзе больш выгадна, чым купіць кватэру танней, але адразу аддаць за рамонт прыстойную суму.

У тым ліку (і ў сувязі з гэтым) цэны ў агульнай статыстыцы і дэманструюць рост, бо пакупнікі выбіраюць кватэры з нядрэнным рамонтам, якія, натуральна, каштуюць даражэй. Пакуль крэдытаванне яшчэ застаецца даступным і ёсць магчымасць выбіраць сярод банкаў, можна разглядаць куплю кватэры. Адпаведна, пакуль гэтыя галоўныя фактары, якія ўплываюць на пакупніцкую здольнасць, застаюцца нязменнымі, сітуацыя на рынку жылля застанецца стабільнай.

## ГАСПАДАРАМ ЛЕПШ НЕ «ЗАДЗІРАЦЬ» ЦАНУ

Падобна, што для прадаўцоў кватэр цяпер самы ідэальны час. Цана нерухомасці на «столі» — самы час «здымаць вяршкі». Але максімізаваць цану продажу пад сілу далёка не ўсім. Усё залежыць ад кватэры. Эксперты рынку прапануюць умоўна падзяліць кватэры на тры вялікія групы.

Першая катэгорыя — самая жаданая сярод пакупнікоў, але далёка не ўсім даступная з-за цаны вышэй сярэднярыначнай. Гэта жыллё ў «свежых» дамах, у ліку якіх новабудоўлі, але ўжо з чыставым рамонтам, каб можна было засяляцца, і дамы да 10—15 гадоў «жыцця», але з месцамі агульнага карыстання ў добрым стане. Гэтыя кватэры выступаюць ідэальнай альтэрнатывай новабудоўлі. Прадаўцы такіх кватэр могуць разлічваць на цану продажу вышэй за сярэднярыначную. Але пры гэтым трэба быць гатовым, што продаж па вялікім цэнніку зацягнецца.

Другая група — кватэры ў стандартных панэльных дамах 1980—1990-х гадоў, дзе месцы агульнага карыстання адпавядаюць «узросту». Прадаўцам такіх кватэр варта выразна арыентавацца на сярэдні кошт па рынку. Да гэтай жа групы можна аднесці класічныя новабудоўлі з чарнавым аздабленнем. Яны першапачатковa прадаюцца даволі дорага. Але пакупнік улічвае, што прыйдзецца яшчэ прыстойна ўкласціся ў рамонт. Таму тут цэннік моцна падняць не атрымаецца.

Трэцяя група, якая знаходзіцца ў зоне рызыкі, паколькі попыт усё ніжэй і ніжэй, — гэта кватэры са старога жылога фонду, з такімі ж пад'ездамі. Гэта могуць быць як стандартныя «панэлькі», так і «хрушчоўкі» або «брэжнеўкі», асабліва тыя, у якіх не было капрамонту. Такія кватэры цікавыя пакупнікам, калі ў іх зроблены добры рамонт. Але калі ж яны далёкія ад сучаснасці, а транспартныя зносіны неразвітыя, то ў такім выпадку прадаўцам для паспяховага продажу варта арыентавацца на цану ніжэй сярэдняй рыначнай.

Так, да апошняга часу мясцовы рынак нерухомасці падымаўся як ніколі раней. Але цяпер трэнд змяніўся. У прыватнасці, з-за вялікіх ставак па крэдытах і больш жорсткіх умоў крэдытавання на фоне і так ужо высокіх цэн пакупнікі ўперліся ў столь сваіх фінансавых магчымасцяў.

**Сяргей КУРКАЧ.**


ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | **ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайты в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29** |

**Первые повторные публичные торги (аукцион). Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 25.10.2024 в газете «Звязда» № 209 (30343), стр. 15**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| № | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб. | Минимальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Пассажирский теплоход «Заря-03», год выпуска – 1975 | 48 620,00 | 38 896,00 |
| 2 | Автомобиль МАЗ 5516, 2008 года выпуска | 22 483,07 | 17 986,46 |
| | **Предмет публичных торгов (аукциона)** | | |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 130/С-51297 общей площадью 179,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Ленина, д. 63. Наименование – здание магазина, назначение – здание специализированное розничной торговли | 28 528,00 | 22 822,40 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 130/С-25779 общей площадью 163,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Ленина, д. 65. Наименование – здание магазина, назначение – здание специализированное розничной торговли | 25 528,00 | 20 422,40 |

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях. Перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи – 10 (десять) рабочих дней** после публичных торгов (аукциона)

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона) – 10 (десять) рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 0,7 % до 1 % в зависимости от конечной цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона) по лотам №№ 1, 2:** 16.12.2024. Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 13.12.2024 г. до 16.00.
**Дата и время проведения торгов (аукциона) по лоту №№ 3, 4:** 09.01.2025. Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 08.01.2025 г. до 17.00.
Начало торгов 10.00, окончание торгов 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03, +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 17.12.2024.**

**Лот № 1: Встроено-пристроенный продовольственный магазин** с инвентарным номером 200/С-51839, 617 кв. м

**Адрес:**
Витебская обл., г. Витебск, ул. Мира, д. 22.
Земельный участок 240100000001001876, 0,3002 га.
Право постоянного пользования.
Доля: 367/2000.
Обременения: ипотека, аренда.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.

Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 708 500,00 долларов США.
Задаток – 242 802,95 руб.
**Шаг электронных торгов** – 2 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов, размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **12.12.2024 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by. Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**

УНП 190055182

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»** (Организатор аукциона) информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **государственному предприятию «НИИ Белгипротопгаз»** на праве хозяйственного ведения **(Продавец)**

**Аукцион состоится 19.12.2024 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

**Лот № 1: Буровая установка AMUR 531300 PBU-2-102, на шасси автомобиля ЗИЛ-131,**
кузов (рама) № X0B5952PA70001288, X9153130060053232

Начальная цена с НДС 20 % – 10 656,00 руб. **Местонахождение:** г. Минск, ул. Стебенева, 14.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу **gki.gov.by** и на электронной торговой площадке Организатора аукциона **gostorg.by.**

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by.**

УНП 190055182

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
4 снежня 2024 г. № 46 (779)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

# КЛЮЧ ДА РАЗВІЦЦЯ МОЦНЫХ РЭГІЁНАЎ

## Што трэба зрабіць, каб людзі заставаліся жыць і працаваць у невялікіх населеных пунктах



**НА выязным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі ў Глыбокім абмеркавалі пытанні будаўніцтва інфраструктуры і жылля ў населеных пунктах з колькасцю жыхароў 20 тысяч чалавек і менш.**

Фота БелТА.

### Забяспечыць дадатковыя прэферэнцыі

У Беларусі налічваецца 22 991 сельскі населены пункт, уключаючы 738 аграгарадкоў. «Найбольшая колькасць сельскіх населеных пунктаў знаходзіцца ў Віцебскай вобласці — 6167, што гаворыць аб асаблівай актуальнасці тэмы пасяджэння для рэгіёна. Нягледзячы на тое што сукупная плошча сельскіх населеных пунктаў у краіне ў тры разы перавышае тэрыторыі, занятыя гарадскімі населенымі пунктамі, доля сельскага насельніцтва складае ўсяго 21 працэнт ад агульнай колькасці грамадзян краіны. Гэтая акалічнасць паказвае на неабходнасць прымянення асаблівых падыходаў пры забеспячэнні жыллём сельскага насельніцтва, а таксама патрабуе вялікіх аб'ёмаў фінансавання для забеспячэння камфортнага пражывання ў сельскай мясцовасці», — адзначыў у сваім дакладзе **міністр архітэктуры і будаўніцтва Раман ПАРХАМОВІЧ.**

Ён падкрэсліў, што за апошнія пяць гадоў колькасць сельскага насельніцтва знізілася на 8,5 працэнта. «Што ў сукупнасці са штогадовым будаўніцтвам жылля на сяле абумовіла паказчык забяспечанасці 40,1 метра квадратнага на аднаго чалавека. Сельскі жыллёвы фонд на канец 2023-га склаў 78,5 мільёна квадратных метраў жылля, або 28,5 працэнта ад усяго жылфонду краіны. У аднакватэрных жылых дамах пражывае практычна 83 працэнты сельскіх грамадзян. На канец 2023 года на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у сельскай мясцовасці знаходзіліся 51,5 тысячы грамадзян. За апошнія пяць гадоў іх колькасць знізілася на 12 працэнтаў. За названы перыяд у сельскай мясцовасці было пабудавана 6,4 мільёна квадратных метраў жылля. У бягучым годзе ў сельскіх населеных пунктах у эксплуатацыю ўведзена каля 980 тысяч квадратных метраў жылля, 220 тысяч з іх пабудавана з дзяржпадтрымкай. Гэтаму паспрыяў шырокі пералік формаў дзяржаўнай падтрымкі, устаноўленых дзейным заканадаўствам», — адзначыў Раман Віктаравіч.

«Вы сказалі, што паказчык забяспечанасці жыллём у сельскай мясцовасці — 40 метраў на чалавека. Гэта высокі паказчык, з улікам таго што па краіне ён складае 30 метраў. Але мы павінны разумець другое: кошт метра квадратнага на сяле вялікі. Не будаваць шматкватэрнае жыллё нельга. Трэба даць людзям дадатковыя прэферэнцыі, каб яны маглі будавацца і жыць у сельскіх населеных пунктах і гарадах з колькасцю насельніцтва 20 тысяч і менш», — адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.**

### Дэфіцыт спецыялістаў

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН** расказаў, што ў 2023 годзе ў вобласці ўведзена ў эксплуатацыю ўжо 317 тысяч квадратных метраў жылля пры заданні 304 тысячы, пабудавана 538 кватэр для шматдзетных сем'яў, звыш 1300 арэндных кватэр, больш за 20 кватэр сацыяльнага карыстання для забеспячэння жыллём сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*







ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Пытанні міжнародныя і лакальныя былі ў цэнтры ўвагі сенатараў на мінулым тыдні

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Алейнік сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Чжанам Вэнчуанем.**

У ходзе сустрэчы абмеркаваны актуальныя пытанні беларуска-кітайскага міжпарламенцкага супрацоўніцтва, уключаючы рэалізацыю дамоўленасцяў, дасягнутых у ходзе афіцыйнага візіту парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай у Кітайскую Народную Рэспубліку ў маі 2024 года. Асаблівую ўвагу ўдзялілі развіццю міжрэгіянальных сувязяў і ўзаемадзеянню ў міжнародных арганізацыях, у тым ліку ў кантэксце старшынства Кітая ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

* * *

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Сяргей Сівец правёў асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб.**



Фота sovrep.gov.by

Заяўнікі звярнуліся да сенатара з пытаннямі, якія датычацца пенсіённага забеспячэння, адукацыі, землеўпарадкавання, абскарджання і выканання судовых пастаноў, нязгоды з рашэннямі мясцовых органаў улады, дзеянняў (бяздзеяння) службовых асоб дзяржаўных органаў.

Сяргей Сівец растлумачыў парадак абскарджання судовых пастаноў, дзеянняў (бяздзеяння) службовых асоб дзяржаўных органаў. Па шэрагу пытанняў на падставе Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 лістапада 1998 г. № 196-З «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь» будуць накіраваны адпаведныя звароты ў органы пракуратуры, мясцовыя органы ўлады, іншыя дзяржаўныя арганізацыі.

Усе звароты ўзяты на кантроль, на пастаўленыя пытанні ва ўстаноўленыя тэрміны будуць дадзены адказы.

* * *

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Ірына Ляўковіч сустрэлася з педагагічнай грамадскасцю Першамайскага раёна г. Віцебска.**

Галоўная тэма — «Будучыня залежыць ад нас» — выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія адбудуцца 26 студзеня 2025 года.

«Выбары з'яўляюцца неад'емным атрыбутам сучаснай дзяржаўнасці. Гэта палітычны інструмент, дзякуючы якому грамадзяне надзяляюць уладнымі паўнамоцтвамі тых, каму давяраюць і ў кім бачаць свайго лідара, здольнага забяспечыць мір, развіццё і дабрабыт», — адзначыла сенатар у сваім выступленні.

Парламентарый звярнула ўвагу на тое, як важна кожнаму прыйсці на выбарчы ўчастак і выканаць свой грамадзянскі абавязак, адказала на ўсе пытанні прысутных.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# КЛЮЧ ДА РАЗВІЦЦЯ МОЦНЫХ РЭГІЁНАЎ

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***



Фота БелТА.

Такая ж сітуацыя працягваецца і сёлета. «На 2024 год Саветам Міністраў пастаўлена задача Віцебскай вобласці ўвесці ў эксплуатацыю 366 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы жылых дамоў, што на 20 працэнтаў перавышае аб'ёмы жылля, якое ўзводзілася ў папярэднія гады. Таксама ў бягучым годзе неабходна забяспечыць жыллём 480 шматдзетных сем'яў, увесці ў эксплуатацыю амаль 30 тысяч квадратных метраў арэнднага жылля, у тым ліку 15 тысяч — для ваеннаслужачых і прыраўнаваных да іх асоб. У 2025 годзе запланавана ўзвядзенне жылля практычна ў кожным раённым цэнтры — Верхнядзвінску, Докшыцах, Паставах, Лепелі, Мёрах, Глыбокім, Браславе, Шаркоўшчыне, Шуміліне і іншых», — адзначыў кіраўнік паўночнага рэгіёна.

Гаворачы аб праблемных момантах, Аляксандр Субоцін падкрэсліў, што недахоп фінансавання запавольвае працэс будаўніцтва ў малых гарадах і сельскіх населеных пунктах. Другая прычына — адток спецыялістаў, за апошнія гады на тэрыторыі рэгіёна рэарганізавана і знаходзіцца ў стадыі ліквідацыі пяць будаўнічых арганізацый. У васьмі раёнах вобласці будаўнічыя арганізацыі адсутнічаюць увогуле. У сувязі з гэтым у вобласці назіраецца дэфіцыт кадраў, у прыватнасці муляраў. Нягледзячы на сярэднюю зарплату па вобласці ў 2500 рублёў, будаўнікі аддаюць перавагу аб'ектам Мінскай вобласці і найбліжэйшых гарадоў Расійскай Федэрацыі.

## Пабудуем — будзем жыць

**Старшыня Глыбоцкага райвыканкама Аляксандр ШУБСКІ** расказаў, што адным з прыярытэтных кірункаў развіцця раёна з'яўляецца жыллёвае будаўніцтва з апераджальным будаўніцтвам інжынерна-транспартнай інфраструктуры. «Так, у новым мікрараёне шматкватэрнай жылой забудовы «Паўночны» пабудавана 17 жылых дамоў з пакватэрным ацяпленнем на прыродным газе. У гэтых дамах палепшылі жыллёвыя ўмовы 1014 сем'яў, з іх 261 — шматдзетная. У мікрараёне пабудаваны дзіцячы сад на 200 месцаў, гандлёвы цэнтр, стаянка аўтамабіляў; уладкаваны парк «Паўночны» з дзіцячай гульнявой і спартыўнай пляцоўкамі; высаджана 640 дрэў. Індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва вядзецца ў раёне вуліцы Радужнай, дзе створана інжынерна-транспартная інфраструктура для будаўніцтва 270 індывідуальных жылых дамоў. За бягучую пяцігодку ў Глыбоцкім раёне ўведзена ў эксплуатацыю 63 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылых дамоў, у тым ліку 15 тысяч квадратных метраў — гэта шматкватэрныя жылыя дамы, 48 тысяч квадратных метраў — аднакватэрныя.



Ад агульнага аб'ёму ўведзенага ў эксплуатацыю жылля доля індывідуальнага складае 75 працэнтаў. За студзень—кастрычнік 2024 года ў Глыбоцкім раёне ўведзена ў эксплуатацыю 9,4 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылых дамоў, у тым ліку 23 індывідуальныя жылыя дамы і адзін 60-кватэрны жылы дом, у якім 18 кватэр прызначана для шматдзетных сем'яў, 24 кватэры адведзена пад арэнднае жыллё», — сказаў Аляксандр Шубскі.

Кіраўнік Глыбоччыны таксама ўнёс шэраг прапаноў, накіраваных на прыток насельніцтва ў горад і населеныя пункты раёна. Сярод іх — для падтрымкі і развіцця малых паселішчаў упаўнаважыць раённыя выканаўчыя камітэты на рашэнне аб даванні арэнднага жылля ў першую чаргу работнікам і спецыялістам, насельніцтву раёна, якія маюць патрэбу ў жыллі; разгледзець пытанне аб павелічэнні нарматыву льготна крэдытаванай плошчы для жыхароў населеных пунктаў да 20 тысяч чалавек; абмеркаваць магчымасць выкупу арэнднага жылля наймальнікамі, якія адпрацавалі ў арганізацыі не менш за 15 гадоў; павялічыць фінансаванне будаўніцтва аб'ектаў інжынерна-транспартнай інфраструктуры і сацыяльнага жылля.

Акрамя таго, надзённай праблемай для горада Глыбокае з'яўляецца пытанне пітнога водазабеспячэння. Патрабуецца рэканструкцыя існага водазабору або магчымае будаўніцтва новага для забеспячэння насельніцтва якасналі пітной вадой.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Леанід ЗАЯЦ** адзначыў, што вялікую ўвагу трэба надаць будаўніцтву арэнднага жылля — варыянта, прывабнага для многіх беларусаў. «Гэта вельмі сур'ёзнае пытанне, якое датычыцца развіцця сельскіх тэрыторый і замацавання кадраў на вёсцы. Прэзідэнтам было даручана разгледзець пытанні будаўніцтва індывідуальнага і арэнднага жылля ў такіх населеных пунктах, у тым ліку з магчымасцю наступнага выкупу гэтага жылля. Мы бачым, што ўсё больш і больш нашы грамадзяне гатовыя пайсці на тое, каб усяліцца менавіта ў арэнднае жыллё. Яно больш даступнае і перспектыўнае. І для прадпрыемстваў: калі чалавек усяліўся ў арэнднае жыллё і сябе зарэкамендаваў з добрых пазіцый, ёсць шанц выкупіць жыллё ў прыватную ўласнасць. Таму ўсе прыёмы добрыя, каб забяспечыць замацаванне кадраў на вёсцы», — дадаў Леанід Заяц.

Падводзячы вынікі выязнога пасяджэння, Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава адзначыла: «Як сказаў наш Прэзідэнт, мэта беларусаў у Год якасці — перасягнуць сябе ва ўсіх сферах жыцця. Гэты тэзіс цалкам адносіцца да тэмы нашай сённяшняй сустрэчы. Калі мы прыязджаем у такія невялікія гарады, мы бачым, наколькі тут выдатная аўра, добрыя людзі жывуць. Нам трэба зрабіць усё, каб моладзь, якая размяркоўваецца, прыязджала і заставалася тут, стварала сем'і, нараджала дзяцей. На мой погляд, сёння ў нашай краіне ёсць усе ўмовы для таго, каб людзі заставаліся і жылі ў такіх гарадах. Акрамя будаўніцтва жылля, неабходна ствараць якасную інфраструктуру, наяўнасць якой не толькі ўтрымлівае насельніцтва, але і прыцягвае новых жыхароў, фарміруючы тым самым спрыяльны фон для далейшага развіцця. Ва ўмовах глабалізацыі, урбанізацыі і пераходу да новых эканамічных мадэляў эфектыўнасць кіравання пытаннямі будаўніцтва жылля і ўладкавання інфраструктуры становіцца крытычна важнай: гэта не толькі камфортнае пражыванне людзей, гэта свайго роду ключ да развіцця моцных і ўстойлівых рэгіёнаў. Таму дадзеная тэма з'яўляецца аб'ектам асаблівай увагі Савета Рэспублікі як палаты тэрытарыяльнага прадстаўніцтва», — заключыла Наталля Іванаўна.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

---

У гэты ж дзень Старшыня Савета Рэспублікі сустрэлася з педагагічным калектывам і навучэнцамі старшых класаў Глыбоцкай раённай гімназіі. Падчас адкрытага дыялогу з моладдзю Качанава закранула тэму дасягненняў нашай незалежнай краіны за 30-гадовы шлях; палітыкі, якая праводзіцца Прэзідэнтам для захавання міру і спакою ў вельмі няпросты час; важнасці будучай выбарчай кампаніі і арыентацыі ў інфармацыйным полі.

«Унутраная палітыка нашай дзяржавы накіравана перш за ўсё на чалавека, яго магчымасці, патрэбы, праблемы. З году ў год робіцца ўсё для таго, каб нашым людзям жылося больш камфортна. Калі казаць пра знешнюю палітыку нашай краіны, то перш за ўсё гэта мір і згода. Ніколі наша краіна нікому не пагражала і пагражаць не будзе. Мы ніколі не падтрымлівалі ваенныя канфлікты. Мы заўсёды казалі, што трэба дамаўляцца мірным шляхам. І сёння, калі на планеце так шмат гарачых пунктаў, вядома, нас не можа гэта не хваляваць і не турбаваць. Сёння самае галоўнае — каб былі мір і спакой на зямлі», — сказала спікер.



Фота БелТА.

Звяртаючыся да маладых людзей, Наталля Іванаўна падкрэсліла, што такога стаўлення да моладзі, як у нашай краіне, цяжка дзесьці знайсці. «У нас 50 законаў, якія ў той ці іншай меры рэгулююць дзейнасць моладзі, даюць магчымасць маладым людзям жыць, вучыцца і працаваць у нашай краіне», — адзначыла Наталля Качанава.

Напрыканцы сустрэчы Старшыня Савета Рэспублікі ўручыла ўстанове адукацыі сертыфікат на набыццё камп'ютарнай тэхнікі, а калектыў і навучэнцы гімназіі, у сваю чаргу, падарылі Наталлі Іванаўне ляльку-глыбачанку, якая сімвалізуе цеплыню і гасціннасць вішнёвай сталіцы.

# «І ЎСЁ Ў ВАС АТРЫМАЕЦЦА»

## Старшыня Брэсцкага аблсавета Ігар БРЫЛЕВІЧ правёў дыялогавую пляцоўку з моладдзю

**У госці да навучэнцаў Брэсцкага дзяржаўнага гандлё-ва-тэхналагічнага каледжа на мінулым тыдні прыйшлі член Савета Рэспублікі, старшыня Брэсцкага абласнога Савета Ігар Брылевіч, намеснік старшыні Брэсцкага гарвыканкама Віталь ШЧЭРБА, дэпутат гарадскога Савета, галоўны ўрач Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы Сяргей КОЎШЫК. Дыялогавая пляцоўка з навучэнцамі праводзілася ў рамках рэспубліканскага асветніцкага праекта «Прэзідэнцкая рэспубліка».**



Сваё выступленне Ігар Брылевіч пачаў з цытаты Прэзідэнта: «У нас ёсць галоўнае, што мы павінны захаваць і перадаць нашчадкам. Гэта наша любімая Радзіма, наша Беларусь. Нам не трэба чужога, свой дабрабыт мы створым самі, сваёй працай на сваёй зямлі».

— Гэта цудоўнае выказванне, якое можа прэтэндаваць на нашу нацыянальную ідэю, — сказаў старшыня абласнога Савета і загаварыў з моладдзю аб асноўных дасягненнях краіны за апошнія 30 гадоў. — Сёння наша краіна з'яўляецца прызнаным суб'ектам міжнародных адносін. Мы ўдзельнічаем у розных міжнародных арганізацыях, і ў рамках усіх без выключэння міжнародных пляцовак наша краіна, Рэспубліка Беларусь, заўсёды ўзнімае пытанні раўнапраўя, бяспекі, развіцця, супрацоўніцтва. Мы заўсёды выступаем за дыялог на падставе ўзаемапавагі.

На канкрэтных прыкладах з дапамогай лічбаў Ігар Максімавіч прадэманстраваў дасягненні нашай краіны, якія дазволілі зрабіць яе эканамічна незалежнай. Напрыклад, такіх: у 1994 годзе валавы ўнутраны прадукт быў на ўзроўні 13 мільярдаў долараў, па выніках 2024 года ён чакаецца каля 70 мільярдаў. Экспарт нашай краіны ў тых жа храналагічных рамках вырас з 5,6 да 50 мільярдаў долараў.

Гаварылі таксама пра развіццё прамысловасці і сельскай гаспадаркі, транспартнай галіны краіны. З дапамогай лічбаў і табліц разбіралі, якое месца ва ўсім гэтым займае Брэсцкая вобласць, а яшчэ — што такое інвестыцыйны праект і як яго рэалізоўваюць. Цікавасць аўдыторыі выклікала размова аб касмічных праектах Беларусі, дасягненнях нашых вучоных і першым палёце беларускага касманаўта...

Асаблівa ажыўленай стала размова, калі перайшла ў форму дыялогу. Напрыклад, у Ігара Брылевіча спыталі, якім чынам, на яго думку, можна дасягнуць жыццёвых вышынь. На гэта пытанне спікер адказаў так: «Нічога не бойцеся, па жыцці ідзіце смела, дапамагайце слабейшым, шануйце старэйшых і, самае галоўнае, любіце нашу Радзіму — родную Беларусь. І ўсё ў вас атрымаецца!»

У старшыні аблсавета спыталі, што кіраўніцтва горада і вобласці плануе зрабіць, каб жыццё моладзі было яшчэ больш змястоўным, цікавым. Ігар Брылевіч спыніўся на праграме мерапрыемстваў, звязаных з патрыятычным выхаваннем. Паводле яго пераканання, малады чалавек павінен расці патрыётам, гэта значыць адданым радзіме, тады ў яго будзе больш стымулаў вучыцца, развівацца, дасягаць новых вяршынь у прафесіі і духоўным узроўні. Расказаў, як ідзе работа па стварэнні Патрыятычнага цэнтра ў Брэсцкай крэпасці. Там круглы год будзе праходзіць навучанне юных грамадзян з усёй краіны. Расказаў і пра новы склад маладзёжнага парламента пры абласным Савеце, падкрэсліў, што парламент закліканы працаваць на карысць моладзі, даносіць да дарослых дэпутатаў пажаданні маладых і дапамагаць ім рэалізоўваць свае хай маленькія, але важныя праекты. Згадалі і міжнародны праект «Цягнік Памяці».

Віталю Шчэрбу навучэнцы задавалі ў тым ліку і практычныя пытанні. Напрыклад пацікавіліся, ці можна працягнуць маршрут 100-га тралейбуса да вуліцы Герояў абароны Брэсцкай крэпасці, на якой знаходзіцца іх навучальная ўстанова. Цікавіліся навучэнцы планамі на ўзвядзенне дзіцячых садкоў і школ у раёнах, дзе яны пражываюць, што цалкам зразумела: у іх ёсць малодшыя браты, сёстры, такія ўстановы адукацыі патрэбны сем'ям. Віталь Шчэрба заўважыў, што за апошнія дзесяць гадоў у горадзе штогод адкрываецца новая школа альбо садок. А з галоўным урачом дзіцячай бальніцы гаварылі нават аб мэтазгоднасці прышчэпак ад ковіду.

Вынікі сустрэчы падвёў Ігар Брылевіч. Старшыня аблсавета падзякаваў юнай аўдыторыі за ўдзел у дыялогавай пляцоўцы, за актыўнасць, пажадаў навучэнцам поспехаў у вучобе, а пазней — і ў рабоце на карысць моцнай, квітнеючай Беларусі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ЧАМУ ВАЖНА ТРЫМАЦЦА РАЗАМ

## Фестываль ініцыятыў да 80-годдзя Перамогі аб'яднаў маладых парламентарыяў Гродзеншчыны

**НАПРЫКАНЦЫ мінулага тыдня падведзены вынікі першага абласнога конкурсу праектаў, якія прадставілі члены Маладзёжнага парламента пры гарадскім, абласным і раённых Саветах дэпутатаў. Усяго на разгляд камісіі паступіла 20 ініцыятыў, з якіх вылучана трое пераможцаў.**



Як падкрэсліла падчас фестывалю **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА,** ніводзін праект не застанецца без увагі. Кожны з іх будзе рэалізаваны ў сваім населеным пункце з прыцягненнем мясцовых улад, устаноў і арганізацый.

— «Будзем трымацца разам» — так называецца першы маладзёжны інтэрактыўны фестываль маладзёжных ініцыятыў. Яго ідэя ўзнікла яшчэ на першай сесіі Маладзёжнага парламента пры Гродзенскім абласным Савеце дэпутатаў, а тэмай, якая аб'яднала маладых парламентарыяў, стала 80-годдзе Вялікай Перамогі. Усе праекты маладзёжных ініцыятыў скіраваны на раскрыццё гэтай тэмы, — зазначыла Алена Пасюта. — Асноўная мэта фестывалю — падтрымка патрыятычнай актыўнасці моладзі, уцягванне маладых людзей у жыццё рэгіёна, пашырэнне магчымасці для самарэалізацыі. Члены маладзёжных парламентаў актыўна ўключыліся ў праектную дзейнасць і падрыхтавалі цікавыя і змястоўныя работы. Многія гатовы самі рэалізоўваць свае ініцыятывы, якія вельмі разнастайныя і крэатыўныя.

У гэтым, дарэчы, можна было ўпэўніцца падчас прэзентацыі праектаў, якія нікога не пакінулі раўнадушнымі. Было відавочна, што тэма Вялікай Перамогі глыбока кранае маладое пакаленне беларусаў.

Напрыклад, у сям'і гродзенскай школьніцы, члена Маладзёжнага парламента пры гарсавеце Аляксандры Сідарэнкавай вельмі ганарацца яе прадзедам Пятром Шукайлам, які дайшоў з баямі да Берліна. А сама дзяўчына вучыцца ў патрыятычным класе і цікавіцца ваеннай гісторыяй. Яе праект «Каляндар Перамогі» стаў найлепшым на фестывалі маладзёжных ініцыятыў.

— Мы штогод кожны дзень з 1 студзеня да 31 снежня будзем выкладваць у сацыяльных сетках Маладзёжнага парламента цікавыя і малавядомыя гістарычныя факты аб ваенным перыядзе Гродзенскай вобласці. Таксама ў ТікТок штомесяц будуць выходзіць кароткія відэа аб вайне, каб паказаць наглядна, які жах напаткаў людзей, іх перажыванні. Лічу, што вучняў і моладзь зацікавіць і гісторыя іх вуліцы, і лёс людзей, розныя унікальныя факты, асабліва калі такую інфармацыю будуць прадстаўляць самі вучні. Мы хочам, каб было больш патрыётаў у нашай краіне, — расказала аб сваёй задумцы Аляксандра.

Праект Ірыны Курдзюк, старшыні Маладзёжнага парламента пры Мастоўскім райсавеце дэпутатаў, таксама ў ліку пераможцаў фестывалю. Гэта патрыятычная гульня «Твой ход». Праект аб'ядноўвае гульню ў шашкі і віктарыну на інтэрактыўнай пляцоўцы памерам тры на тры метры. Дыяметр шашкі — 30 сантыметраў, вышыня — 10 сантыметраў. Пад шашкай знаходзіцца пытанне, якое задае той, хто робіць ход. У працэсе гульні можна даведацца больш фактаў аб Вялікай Айчыннай вайне.

У тройку пераможцаў увайшла ініцыятыва слонімскіх маладых парламентарыяў. У іх ёсць ідэя ўвекавечыць імёны герояў-землякоў у назвах вуліц. Цяпер у горадзе 23 вуліцы і аб'екты названы імёнамі герояў і ўдзельнікаў вайны, з іх 13 — Героі Савецкага Саюза. Аднак не ўсе тыя, хто абараняў горад і раён, увекавечаны такім чынам. Да таго ж ёсць патрэба ў стварэнні і аднаўленні 25 мемарыяльных дошак, запуску афіцыйнага інтэрнэт-рэсурсу.







Многія іншыя праекты таксама атрымалі высокую ацэнку членаў конкурснай камісіі. У гэтым шэрагу — «Сцяна памяці», якую прадставіў Бераставіцкі раён. Сабраную інфармацыю аб сваіх земляках, удзельніках вайны, тут мяркуюць аформіць у выглядзе сцяны ў музейным пакоі.

Маладзёжны парламент пры Ваўкавыскім раённым Савеце дэпутатаў выйшаў з прапановай аднаўлення і рэканструкцыі помніка «Воін і партызанка», які знаходзіцца ў аграгарадку Падароск на брацкай магіле. Тут пахаваны астанкі 160 воінаў, якія загінулі на пачатку вайны і падчас вызвалення Ваўкавыскага раёна. Прапаноўваецца ўстаноўка новага гранітнага пакрыцця. Прадугледжваецца таксама і добраўпарадкаванне самой тэрыторыі.

Маладыя парламентары Воранаўскага раёна гатовыя прыняць удзел у стварэнні на шматпавярховіку мурала, прысвечанага Дню Перамогі. Асноўны этап рэалізацыі запланаваны на сакавік будучага года з прыцягненнем прафесійнага мастака-монументаліста. Адкрыццё мурала будзе прымеркавана да Дня Перамогі.

«Дарогу Памяці» прапаноўваюць увекавечыць памятным знакам члены Маладзёжнага парламента Зэльвенскага раёна. Напачатку вайны на беразе рэчкі Зальвянкі ішлі жорсткія баі, вялікая колькасць савецкіх часцей аказалася ў коле ворага, байцы геройчна змагаліся і разграмілі 117-ы нямецкі пяхотны полк. Аперацыя вядомая пад назвай «Зэльвенскі прарыў». Каб захаваць памяць аб гэтых абаронцах, маладыя зэльвенцы прапануюць устанавіць памятны знак каля дарогі, а ў далейшым — і банер з указаннем часцей Савецкай Арміі, якія тут геройчна змагаліся.

У Лідскім Маладзёжным парламенце выйшлі з міжнародным праектам, у рэалізацыі якога задзейнічаны лідчане і іх партнёры з Алтайскага краю Расіі. У планах — арганізаваць работу пляцоўкі па ўзаемадзеянні моладзі Саюзнай дзяржавы і стварэнне міжнароднага зборніка літаратурных твораў паводле ўспамінаў ветэранаў-землякоў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Дэпутаты Маладзёжнага парламента пры Свіслацкім райсавеце прапануюць стварыць на тэрыторыі кожнай установы адукацыі інтэрактыўную «Лаўку вечнай памяці» — усяго адзінаццаць на ўвесь раён. На пляцоўцы будзе ўстаноўлена чырвоная зорка, лаўка і камень з таблічкай і QR-кодам, па якім можна атрымаць інфармацыю аб земляках — удзельніках вайны і іх подзвігах...

Як паведаміла Алена Пасюта, некалькі праектаў могуць быць прадстаўлены на абласны конкурс грамадзянскіх ініцыятыў. Яго новы этап пачнецца ў студзені будучага года. Праекты могуць трапіць у спіс пераможцаў і атрымаць пэўную суму сродкаў на іх рэалізацыю.

**МАРГАРЫТА УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

КАРЫСНЫ ДОСВЕД



# АЦЭНКУ ДАЮЦЬ ЖЫХАРЫ

## Народныя выбраннікі азнаёміліся з вопытам работы Сапрынавіцкага сельсавета Мсціслаўскага раёна

**У Мсціслаўскім райсавеце эфектыўна ў плане вырашэння мясцовых праблем працуе такая форма, як семінар-нарада Дзень Савета. Выбіраецца адзін з сельсаветаў (а іх у раёне восем), і на яго прыкладзе аналізуецца ўся тая работа, якая тут праводзіцца рознымі суб'ектамі гаспадарання. Мэта — зрабіць жыццё сялян больш камфортным і якасным. Гэтым разам знаёміліся, як у азначаным кірунку працуе Сапрынавіцкі сельсавет. Мерапрыемства адбылося з удзелам члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыні Магілёўскага аблсавета Аляксандра ГАРОШКІНА, прадстаўнікоў дэпутацкага корпуса і выканаўчай улады Мсціслаўскага раёна, кіраўнікоў мясцовых арганізацый.**

### Пляцоўка з відам на возера

Сёлетнім летам у вёсцы Сапрынавічы ўрачыста адкрылі спартыўную дзіцячую пляцоўку. Ініцыятыву па будаўніцтве, якая сыходзіла ад жыхароў, падтрымалі дэпутаты. Мясцовая гаспадарка ААТ «Кастрычнік» прадставіла неабходную тэхніку, на аб'екце шчыравалі і дарослыя, і дзеці. У выніку тут ёсць усё, што трэба для дзіцячага адпачынку: футбольныя вароты, арэлі, горкі. На гэтым месцы якраз і адбылася сустрэча жыхароў вёскі з удзельнікамі семінара-нарады.



— Вуліца наша невялікая, на ёй жывуць 21 дарослы і двое дзяцей, — расказала **стараста Наталля ЛОСЕВА.** — Але падчас канікул да бабуль і дзядуляў прыязджае каля 20 хлопчыкаў і дзяўчынак. Для дзяцей гэта пляцоўка вельмі важная і неабходная. Яны ганарацца, што бралі ўдзел у яе будаўніцтве, сочаць за парадкам, нічога не разбураюць. 1 чэрвеня, у Міжнародны дзень дзяцей, мы рабілі тут вялікае свята з пачастункамі. Усім вельмі спадабалася.

Месца для пляцоўкі сапраўды ідэальнае. Выгляд надзвычай маляўнічы. Уніз возера, а за ім, як на далоні, сельскія домікі. Вельмі прыгожа.

— Тое, што зроблена сваімі рукамі, больш цэніцца, — даў адзнаку ініцыятыве Аляксандр Гарошкін. — Калі людзі разумеюць, што ім трэба, і самі гатовы працаваць, то і падыход зусім іншы.

### Разанцы — аграгарадок з камфортам

Населены пункт быў пабудаваны ў 1990 годзе для перасяленцаў, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, але хутка стаў прывабны і для іншых жыхароў. Цяпер тут жывуць у міры і згодзе прадстаўнікі пяці нацыянальнасцяў. Аграгарадок развіваецца, будуюцца новыя аб'екты: напрыклад, царква.

Мець свой храм было запаветнай марай тутэйшых, і летась пачалося яго будаўніцтва. Грамадскую ініцыятыву падтрымалі сельгаспрадпрыемства «Кастрычнік», мясцовыя арганізацыі, прадпрымальнікі. Жыхары аграгарадка дапамагалі і фінансава, і фізічна.

У Разанцах дэпутаты падрабязна азнаёміліся з работай розных аб'ектаў. Мясцовае аддзяленне сувязі аказвае шэраг паслуг, не толькі паштовых. І робіць гэта з выкарыстаннем сучасных тэхналогій.

— Кожнае аддзяленне сувязі ў раёне абсталяванае аўдыя- і відэакантролем, — паведаміла **начальнік Мсціслаўскага раённага вузла паштовай сувязі Магілёўскага філіяла РУП «Белпошта» Галіна ЗАЯНЧКОЎСКАЯ.** — Паштальёны забяспечаны апаратна-праграмным комплексам «Мабільны паштальён», які дае магчымасць аказваць усе паслугі жыхарам аддалена.

Што датычыцца аддзялення паштовай сувязі ў Разанцах, то, як запэўніла Галіна Заянчкоўская, яно рэнтабельнае. Тавараабарот складае ў сярэднім 14 тысяч рублёў з ростам 123 % да мінулага года.

Сваю дзейнасць прэзентавала прадпрыемства паслуг «Мсціслаўчанка». Спецаўтамабіль арганізацыі па графіку аб'язджае глыбінку — збірае заказы на рамонт абутку, адзення. Тут жа можна заказаць сувенірную і тэкстыльную прадукцыю. Транспарт абсталяваны нават цырульняй.

Не было заўваг да работы крамы райспажыўтаварыства. Яе месячны тавараабарот складае 74 тысячы рублёў. У наяўнасці «малочка» некалькіх вытворцаў, хлеб, агародніна-садавіна, іншыя прадукты. Тут можна заказаць халадзільнік, тэлевізар, іншыя тавары.

Удзельнікі семінара ацанілі таксама магчымасці мясцовага ФАПа і наведалі дзіцячы дом сямейнага тыпу.

### Прэзентацыя ад сельсавета

Вынікі былі падведзены на пленарным пасяджэнні, якое прайшло на базе Разанцаўскага вучэбна-педагагічнага комплексу «Дзіцячы сад — сярэдняя школа». Тут вучацца, наведваюць дзіцячы сад больш чым 100 дзяцей з аграгарадка і навакольных вёсак. Установа дапамагае развівацца дзецям іх творчы і спартыўны патэнцыял. У фае на другім паверсе, дзе адбылася выстаўка-прэзентацыя дасягненняў Савета, можна было ўбачыць, наколькі цікавым і насычаным жыццём тут жывуць. Уразіла вялікая колькасць спартыўных кубкаў, а ўжо ад століка, дзе падлеткі дэманстравалі смакату, якую яны робяць з садавіны-агародніны, адысці было немагчыма. Фрыпсы, цукаты, пасціла, мармелад, гарбата — м-м-м як смачна. Дзяцей тут з самага пачатку прывучаюць да працы, яны бачаць яе вынікі і натхняюцца.

Немагчыма было адысці і ад століка Анастасіі Смірновай. На выставе яна частавала смачнымі пірагамі і булачкамі. Жанчына родам з Санкт-Пецярбурга, скончыла там універсітэт, выйшла замуж і пераехала з мужам на яго радзіму. Аграгарадок ёй падабаецца — тут ціха, спакойна, няма мітусні. «Дзяцей трэба расціць у вёсцы, — перакананая яна. — У горад ужо і не цягне. Дом тут».



### Стаўка на папярэджванне

На пленарным пасяджэнні падрабязна расказвалася аб рабоце Сапрынавіцкага сельсавета ў цэлым і, у прыватнасці, са зваротамі грамадзян.



— Мы рыхтуемся да семінара-нарады загадзя, — адзначыла **старшыня Мсціслаўскага райсавета Алена КЛЕЯНКОВА.** — Адбыліся выезды ў аддаленыя і маланаселеныя пункты Сапрынавіцкага сельсавета, каб даведацца пра існыя там праблемы і знайсці шляхі вырашэння. Правялі сустрэчу з жыхарамі аграгарадка Разанцы. Быў падрыхтаваны пратакол даручэнняў па праблемных пытаннях, які на пленарным пасяджэнні прааналізавалі: што выканана, а што — не. Праводзім таксама анкетаванне грамадзян, каб выявіць праблемныя моманты. Жыхары даюць ацэнку дзейнасці дзяржаўных органаў, суб'ектаў гаспадарання, якія забяспечваюць жыццядзейнасць сельсавета, і мы працуем над недахопамі. Проста прыехаць і пахадзіць сэнсу няма. Гэта маштабная сістэмная работа, якая прадугледжвае аналіз праблем і іх вырашэнне.

### Дзень Савета як маленькія «Дажынкі»

**Старшыня Сапрынавіцкага сельсавета Вера АГАРОДНІКАВА** паведаміла, што да Дня Савета рыхтаваліся ўсе.

— Першай справай вызначылі аб'ёмы работ, дзе што трэба было падправіць, — падзялілася яна. — Нашы арганізацыі і ўстановы добра ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, дапамагаюць адна адной вырашаць розныя пытанні. Вялікую падтрымку аказвае сельгаспрадпрыемства «Кастрычнік», якое раманту дарогі, удзяляе ўвагу рэалізацыі ініцыятыў. Жыхары наводзілі парадак на сваіх тэрыторыях, стараліся, каб у іх было не горш, чым у цэнтры. Агароджы падправілі, параўнялі, хмызняк высякалі і нам яшчэ дапамаглі — зрабілі сумеснымі намаганнямі клумбу.

Сёлета семінар-нарада Дзень Савета праходзіў і ў Ходасаўскім сельсавеце.

— Такія мерапрыемствы даюць штуршок нашым новым ідэям і ініцыятывам, — лічыць **старшыня гэтага сельсавета Анатоль ПРУДНІКАЎ.** — Вельмі добрая практыка — праводзіць перад Днём Савета анкетаванне насельніцтва. Адразу ж бачна, што дзе не так. Дзякуючы гэтаму тэсціраванню, даведваемся, што турбуе насельніцтва. Напрыклад, жыхары вёскі Пячковічы папрасілі, каб мы для іх арганізавалі Дзень вёскі. І мы яго правялі. Там жыве ўсяго 12 чалавек, а на свята прыйшло 85. Прыехалі дзеці, унукі з суседніх абласцей. Некаторыя сем'і прысутнічалі аж у чатырох пакаленнях. Наогул Дзень Савета — гэта як невялікія «Дажынкі», яшчэ адна нагода правесці добраўпарадкаванне з удзелам арганізацый і прадпрыемстваў.

**Старшыня Капачоўскага сельсавета Сяргей ФЯДОСАЎ** перакананы, што форма правядзення дзён Савета вельмі эфектыўная.

— Мерапрыемствы праходзяць рэгулярна, двойчы ў год, і ахопліваюць усе суб'екты гаспадарання, якія знаходзяцца на тэрыторыі, — адзначае ён. — Ездзім, глядзім, нешта потым укараняем у сябе. Самае карыснае, што сваімі дзеяннямі заахвочваем насельніцтва. Ад кожнага па крышачку, і тады ўсё агульнае будзе прыгожае.

Яго **калега з Краснагорскага сельсавета Людміла КАВАЛЁВА,** запэўніла, што такія мерапрыемствы дапамагаюць увесь час трымаць сябе ў тонусе. Хочацца ж быць не горш за іншых.

### Важна чуць людзей

Як адзначыў **старшыня Мсціслаўскага райвыканкама Юрый БЛАХІН,** людзі павінны адчуваць, што мясцовая ўлада робіць усё магчымае, каб якасць іх жыцця павышалася.

— Вядома, не ўсё мяняецца за адно імгненне, — удакладніў ён. — Але мы чуем людзей і разумеем іх патрэбы.

Старшыня аблсавета Аляксандр Гарошкін адзначыў, што ў раёне наладжана выразная сістэма работы з насельніцтвам пачынаючы з пачатковага ўзроўню.

— Старасты, старшыні сельсаветаў плённа ўзаемадзейнічаюць з кіраўніцтвам раёна, — аргументаваў ён. — Гэта штодзённая сістэмная работа дае свой вынік. Мне падабаецца, што тут вялікі працэнт людзей, якія гатовыя самі ўдзельнічаць у добраўпарадкаванні тэрыторыі, выступаюць з грамадзянскімі ініцыятывамі. Пабудавалі ў аграгарадку храм — выдатная ініцыятыва. Людзі настроены працаваць і робяць гэта з жаданнем. Ну а выканаўчая і прадстаўнічая раённыя ўлады аказваюць дапамогу ў рэалізацыі іх ініцыятыў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**
*Мсціслаўскі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 10.785. Нумар падпісаны ў 19.30 3 снежня 2024 года.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# НЕ ЗАХВАРЭЦЬ У СЕЗОН ПРАСТУД

## Як абараніцца ад ВРВІ і ўмацаваць імунітэт

**З надыходам зімы ў наша жыццё разам з холадам урываецца віхор сезонных ВРВІ. Як абараніць сябе і блізкіх? Пра меры прафілактыкі і ўмацаванне імунітэту расказала ўрач-гігіеніст, загадчык аддзялення інфармацыйна-метадычнай работы аддзела грамадскага здароўя Алена ЛОЙКА.**



Самыя распаўсюджаныя захворванні ў халодны перыяд года — вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі (ВРВІ).

— Прастудныя вірусныя захворванні выклікаюць розныя штамы вірусаў — іх больш за 150. Вялікая колькасць самых рэспіраторных узбуджальнікаў, іх разнастайнасць вызначае магчымасць развіцця паўторнага захворвання. Шырокаму распаўсюджванню ВРВІ спрыяюць досыць «эфектыўныя» шляхі перадачы інфекцыі — паветрана-кропельны і кантактна-бытавы, — нагадвае ўрач.

Ад моманту заражэння да першых праяў хваробы праходзіць некалькі дзён (ад 1 да 4), гэты перыяд называецца інкубацыйным.

Нярэдка можна пачуць, што ВРВІ і грып — гэта адно і тое ж, па сутнасці, так і ёсць. Аднак найважнейшае адрозненне грыпу ад іншых ВРВІ — яго масавасць і эпідэмічнае распаўсюджванне, якое характарызуецца цяжкарам хваробы і яе лячэння.

### КАБ ПАЗБЕГНУЦЬ ХВАРОБЫ...

Прафілактыка прастуды падзяляецца на спецыфічную і неспецыфічную.

Адзіным метадам спецыфічнай прафілактыкі грыпу з'яўляецца вакцынацыя. Прышчэпка забяспечвае выпрацоўку ахоўных антыцел для барацьбы з інфекцыяй.

Супраціўляльнасць імуннай сістэмы чалавека таксама можна павысіць, не пакінуўшы прастудзе ніякіх шанцаў, выконваючы меры неспецыфічнай прафілактыкі.

Найперш — правільна і паўнавартасна харчавацца. Ежа павінна ўтрымліваць дастатковую колькасць бялкоў, тлушчаў, вугляводаў, вітамінаў і мікраэлементаў. Спрыяльна ўплываюць на імунітэт такія прадукты, як марская рыба, алей, семачкі і арэхі. Асаблівую ўвагу аддайце вітаміну С, які змяшчаецца ў шыпшыне, журавінах, чорных парэчках, брусніцах, малінах і цытрусавых, квашанай капусце. Варта дапоўніць свой рацыён такой агароднінай, як цыбуля і часнок. У восеньска-вясновы перыяд, калі колькасць агародніны і садавіны ў рацыёне зменшаецца, магчымы дадатковы прыём комплексу вітамінаў.

Важна займацца фізічнымі практыкаваннямі і загартоўвацца. Людзі, якія вядуць актыўны лад жыцця, значна радзей падвяргаюцца прастудным захворванням. Калі няма часу на наведванне спартыўнай залы, можна абмежавацца зарадкай. Ва ўмацаванні імунітэту таксама дапамогуць рэгулярныя прагулкі пешшу, выкананне дыхальных практыкаванняў, заняткі плаваннем, перыядычныя паходы ў саўну. Пазбягайце пераахаладжэнняў, апранайцеся з улікам надвор'я.

Неабходна прытрымлівацца балансу працы і адпачынку. Аптымальны рэжым павінен прадугледжваць дастатковы час для сну, працоўнай дзейнасці, адпачынку і прыёму ежы. Як мага больш спіце ноччу, бо недахоп сну спрыяе аслабленню імуннай сістэмы.

Адмоўцеся ад шкодных звычак, асабліва ад курэння, бо яно пашкоджвае нашы натуральныя бар'еры ад інфекцыі: слізістую, бронхі, трахею. Пазбягайце стрэсаў — псіхалагічнае напружанне таксама можа стаць прычынай зніжанага імунітэту.

### АБАВЯЗКОВЫЯ ПРАВІЛЫ:

- мыйце рукі з мылам і карыстайцеся антысептычнымі сродкамі, а таксама пазбягайце дакранацца рукамі да твару і вачэй;
- не кантактуйце з людзьмі, у якіх назіраюцца прыкметы ВРВІ і грыпу (чханне, кашаль), пры неабходнасці карыстайцеся медыцынскай маскай;
- пазбягайце месцаў з вялікай колькасцю людзей падчас высокага ўзроўню захворвання;
- часцей праветрывайце жылыя і працоўныя памяшканні. Праветрыванне і вільготная прыборка памяншаюць колькасць мікраарганізмаў у паветры, тым самым зніжаючы верагоднасць заражэння;
- прыкрывайце рот і нос сурвэткай пры кашлі і чханні. Пры адсутнасці насоўкі чхаць і кашляць трэба ў згін локця, а не ў далоні.

Калі ўсё ж вы выявілі першыя прыкметы захворвання ў сябе ці ў блізкіх, звяртайцеся да ўрача для прызначэння правільнага лячэння. Ні ў якім разе не займайцеся самалячэннем, бо кожны асобны выпадак захворвання патрабуе адпаведнага лячэння ў залежнасці ад яго асаблівасцяў.

# НЕБЯСПЕЧНА, КАЛІ НЕ ВЕДАЕШ

## Чаму важна своечасова выявіць ВІЧ-інфекцыю?



**У Беларусі з 1987 года зарэгістравана каля 36 тысяч выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. Цяпер у краіне жыве каля 25 тысяч чалавек з гэтым захворваннем. Яго распаўсюджанасць нераўнамерная: больш за 70 % людзей з ВІЧ жыве ў трох рэгіёнах: Гомельскай і Мінскай абласцях і Мінску. З пачатку года ў краіне выяўлена каля тысячы новых выпадкаў ВІЧ-інфекцыі.**

### Кожнаму другому дыягназ ставяць позна

На сёння ВІЧ-інфекцыя з'яўляецца хранічным інфекцыйным захворваннем, якое пры належным і своечасова распачатым лячэнні не прыводзіць да смерці ці да нейкіх цяжкіх наступстваў са здароўем. Аднак для барацьбы з яго распаўсюджваннем Сусветная арганізацыя аховы здароўя вызначыла мэты, так званыя 95-95-95. Гэта азначае, што свой статус павінны ведаць 95 % усіх людзей, якія жывуць з вірусам імунадэфіцыту чалавека, 95 % з іх павінны атрымліваць жыццёва важную антырэтравірусную тэрапію, а 95 % тых, хто яе атрымлівае, павінны дабіцца супрэсіі віруснай нагрузкі, што будзе садзейнічаць паляпшэнню стану іх здароўя і немагчымасці далейшай перадачы віруса імунадэфіцыту.

Аднак колькасць новых выпадкаў ВІЧ расце як у свеце, так і ў Еўрапейскім рэгіёне. Як паведаміў **прадстаўнік СААЗ у Рэспубліцы Беларусь, кіраўнік краінавага офіса СААЗ у Беларусі Сяргей ДЗІОРДЗІЦА,** у Еўрапейскім рэгіёне СААЗ, які ахоплівае 53 краіны Еўропы і Цэнтральнай Азіі, колькасць новых выпадкаў ВІЧ-інфекцыі ў 2024 годзе павялічылася на 7 % у параўнанні з 2010 годам. У кожнага другога чалавека са станоўчым тэстам на ВІЧ інфекцыю дыягнастуюць позна. Палова ўсіх людзей, якія жывуць з ВІЧ, ва Усходняй Еўропе і Цэнтральнай Азіі, усё часцей не атрымліваюць антырэтравірусную тэрапію і толькі 42 % маюць вірусную супрэсію, гэта значыць больш не перадаюць вірус.

— Гэтая тэндэнцыя патрабуе ад краін прыняцця больш эфектыўных і інавацыйных мер па выяўленні ВІЧ-інфекцыі, уключаючы ўкараненне новых алгарытмаў тэсціравання, заснаваных на экспрэс-тэстах, пашырэнне ахопу прафілактычнымі і дыягнастычнымі паслугамі для ключавых груп насельніцтва, — адзначыў Сяргей Дзіордзіца. — Сёння ў нас ёсць усе неабходныя лекі, інструменты і тэхналогіі, каб пакончыць са СНІДам. Станоўчы тэст на ВІЧ больш не з'яўляецца смяротным прысудам. Антырэтравірусная тэрапія дазваляе людзям, якія жывуць з ВІЧ, весці здаровае доўгае жыццё, асабліва калі хвароба выяўлена на ранняй стадыі, а яны прымаюць антырэтравірусныя прэпараты.

СААЗ адзначае намаганні Міністэрства аховы здароўя Беларусі па забеспячэнні ўніверсальнага і стопрацэнтнага бясплатнага доступу да сучаснага антырэтравіруснага лячэння людзей, якія жывуць з ВІЧ, — у Беларусі гэта стала магчымым з 2018 года.

— Адной з ключавых задач Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў галіне прафілактыкі ВІЧ і СНІДу з'яўляецца даванне доказнай базы для барацьбы з ВІЧ-інфекцыяй. І ў гэтым кантэксце з задавальненнем хачу адзначыць, што Беларусь аператыўна абнаўляе і паляпшае нарматыўную базу і праграмы па прафілактыцы і лячэнні ВІЧ-інфекцыі на аснове рэкамендацый СААЗ. Трэба адзначыць, што з пачаткам усеагульнага доступу да антырэтравіруснага лячэння ў Беларусі змянілася і тэндэнцыя першаснай захваральнасці на ВІЧ. Пачынаючы з 2018 года мы бачым ужо станоўчую тэндэнцыю зніжэння тэмпаў з'яўлення новых выпадкаў, — дадаў Сяргей Дзіордзіца.

Важным крытэрыем эфектыўнасці работы, паводле яго слоў, з'яўляецца і папярэджанне так званай вертыкальнай перадачы ВІЧ-інфекцыі ад маці да дзіцяці. У 2016 годзе Беларусь першай з краін Еўрапейскага рэгіёна атрымала афіцыйнае прызнанне на міжнародным узроўні і ёй быў уручаны адпаведны сертыфікат СААЗ.

### Рызыкоўныя паводзіны — галоўная прычына распаўсюджання

Як паведаміла **ўрач-эпідэміёлаг аддзела прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі і парэнтэральных вірусных гепатытаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Лізавета ПРЫЛАЖЫНСКАЯ,** за 10 месяцаў 2024 года ў Беларусі выяўлена каля тысячы новых выпадкаў ВІЧ-інфекцыі, што на 14 % ніжэй за аналагічны леташні перыяд.

Захворванне ў нашай краіне распаўсюджваецца пераважна сярод сацыяльна актыўных груп насельніцтва працаздольнага ўзросту. У асноўным гэта людзі ад 30 да 49 гадоў. Нязменнымі застаюцца асноўныя шляхі перадачы ВІЧ-інфекцыі: палавы шлях пры неабароненых кантактах без выкарыстання прэзерватыва і парэнтэральны шлях пры ін'екцыйным увядзенні наркатычных рэчываў або выкарыстанні нестэрыльнага медыцынскага інструментарыю. У Беларусі асноўным шляхам перадачы з'яўляецца палавы, на долю якога прыпадае 84 % ад усіх новых выпадкаў.

— ВІЧ-інфекцыя многія гады асацыіравалася з пэўнымі групамі рызыкі, напрыклад людзьмі, якія ўжываюць наркотыкі, або работнікамі камерцыйнага сексу. Аднак варта звярнуць увагу, што сёння мы стараемся не ўжываць тэрмін «групы рызыкі», а рабіць акцэнт менавіта на рызыкоўных паводзінах, бо ў сілу розных абставін любы чалавек можа практыкаваць такія паводзіны, незалежна ад яго сацыяльнага статусу або прыналежнасці да той ці іншай групы, — адзначыла Лізавета Прылажынская. — Любая дыскрымінацыя ці стыгматызацыя людзей, якія жывуць з ВІЧ, недапушчальная. Гэта прыводзіць да нежадання ці нават страху перад абследаваннем на ВІЧ-інфекцыю, да зніжэння звароту па паслугі, звязаныя з прафілактыкай, — звярнула ўвагу ўрач-эпідэміёлаг.

Сталіца, як адзначалася, — адзін з трох неспрыяльных рэгіёнаў па распаўсюджанні ВІЧ-інфекцыі. Як паведаміла **ўрач-інфекцыяніст Дзяржаўнай клінічнай інфекцыйнай бальніцы, выконваючая абавязкі загадчыка аддзялення Кансультатыўна-дыспансернага аддзялення па ВІЧ-інфекцыях Ганна ШАМЕЦЬКА,** у Мінску на ўліку знаходзіцца каля 5400 чалавек, якія жывуць з ВІЧ, з іх лячэнне атрымлівае больш за 90 %. На базе сталічнай інфекцыйнай бальніцы дзейнічае праграма па вядзенні цяжарных. На сёння ў Мінску назіраецца 37 цяжарных з ВІЧ-інфекцыяй, з іх 19 былі перададзены пад назіранне сацыяльных работнікаў для таго, каб прафілактаваць перадачу ВІЧ-інфекцыі ад маці да дзіцяці. Рэалізоўваецца і дзяржпраграма па вышуку і матывацыі да лячэння асоб, якія знаходзяцца ў сацыяльна неспрыяльных умовах, сёлета ёй ахоплены 207 чалавек.

Сярод мер прафілактыкі спецыялісты называюць практыку абароненых палавых кантактаў — з выкарыстаннем прэзерватыва. Акрамя таго, важна своечасова дыягнаставаць ВІЧ-інфекцыю, паколькі чым раней чалавек даведаецца аб сваім дыягназе, тым менш гэта адаб'ецца на яго здароўі.

## Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 18 декабря 2024 г. в 10.00 повторного открытого аукциона с понижением начальной цены на 50 % после вторых несостоявшихся торгов по продаже трактора «Беларус МТЗ-82.1», принадлежащего открытому акционерному обществу «Гомельстекло» на праве собственности

| № лота | Наименование и характеристика объекта | Начальная цена, рублей (в т. ч. НДС 20 %) | Задаток, рублей (в т. ч. НДС 20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Трактор колесный категории «А» «Беларус МТЗ-82.1», 2006 года выпуска,** инв. № 147911. Заводской № 80833739. Двигатель: марка Д-243, № 716257. Снят с учета в связи с продажей | **11 940,00** | **600,00** |

**Местонахождение транспортного средства:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Михаила Ломоносова, 25

Шаг аукциона – 5 %.
**Место проведения аукциона:** г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артёма, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 09.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 17.12.2024 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.
В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **18.12.2024 г.** Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.
**При подаче заявления участник должен иметь:** 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и иметь при себе все данные по счету.
Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 04.12.2024 г.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан:** в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 5 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в течение 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке.
*Извещения о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту были опубликованы в газете «Звязда» от 27.09.2024 г. № 189, от 05.11.2024 г. № 216*

**Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 232 32-46-47; 32-18-95; +375 29 170-46-47. Сайт: ino.by • e-mail: auction-gino@gino.by.**
**Продавец: ОАО «Гомельстекло», г. Гомель, ул. Михаила Ломоносова, 25, тел.: +375 29 615-55-20; +375 29 171-07-69**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | **ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайты в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102** |

**Пятые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) ранее опубликовано 06.11.2024 в газете «Звязда» № 217 (30351), стр. 12**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| № | Наименование (назначение), адрес | Начальная цена | Минимальная цена |
|---|---|---|---|
| 1 | Дебиторская задолженность. Наименование дебитора: Акционерное общество «Торговый дом «Оргсинтез» (125319, Россия, г. Москва, Муниципальный округ аэропорт вн. тер. г., ул. Академика Ильюшина, д. 12, эт/пом/ком/оф 1/VII/АЗД, огрн: 1127747058284, дата присвоения ОГРН: 18.10.2012, ИНН: 7714887246, КПП: 771401001). | По цене, исходя из стоимости в белорусских рублях, эквивалентной 9 153,41 росс. руб. без НДС по курсу НБ РБ на день проведения торгов | По цене, исходя из стоимости в белорусских рублях, эквивалентной 5 949,72 росс. руб. без НДС по курсу НБ РБ на день проведения торгов |
| **Вторые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) ранее опубликовано 06.11.2024 в газете «Звязда» № 217 (30351), стр. 12** | | | |
| 2 | Кран опорный Г-П 2.0 ТН Л-6М с инв. № 2595, бывший в эксплуатации | 3 168,00 бел. руб. с учётом НДС | 1 584,00 бел. руб. с учётом НДС |
| 3 | Электрокран-балка 3,2 Т с инв. № 29402, бывший в эксплуатации | 3 264,00 бел. руб. с учётом НДС | 1 632,00 бел. руб. с учётом НДС |
| **Третьи повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) ранее опубликовано 06.11.2024 в газете «Звязда» № 217 (30351), стр. 12** | | | |
| 4 | Склад готовой продукции, корпус № 66, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102/76 | 359 402,40 бел. руб. с учётом НДС | 102 686,40 бел. руб. с учётом НДС |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **1 % – 4 % от цены продажи лота, в зависимости от цены продажи лота**

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 19.12.2024, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются **с 04.12.2024 по 18.12.2024 г. до 16.00**

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03, +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

# ИЗМЕНЕНИЯ № 2 В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

## по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями по пр. Дзержинского», опубликованную в газете «Звязда» от 30.01.2024 г. № 20 (30154)

### Сведения о застройщике

**Застройщик:** общество с ограниченной ответственностью «ТАПАС» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.07.2001 за № 101484246.

**Юридический адрес и местонахождение предприятия:** 220114, г. Минск, пр-т Независимости, д. 173, пом. 215-4, тел./факс (017) 302 84 10/15.

**Офис продаж:** г. Минск, пр-т Независимости, 173, 2-й этаж, офис 210, тел. +375 (29) 340 05 40.

**Режим работы офиса продаж:** понедельник – четверг с 09.00 до 18.00, пятница с 9.00 до 16.45.

Сведения о жилых домах и иных объектах недвижимости, в строительстве которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации, с указанием информации о фактических сроках строительства данных объектов:

- жилой дом № 123 по пр-ту Дзержинского в г. Минске – 64 мес.;
- жилой дом № 45 по ул. Ржавецкой в г. Минске – 23 мес.;
- жилой дом № 47 по ул. Ржавецкой в г. Минске – 27 мес.;
- жилой дом № 49 по ул. Ржавецкой в г. Минске – 25 мес.;
- одноквартирные жилые дома №№ 4, 6, 6А, 8, 8А, 10, 10А, 12, 12А, 14, 14А, 16, 16А по ул. Ратомской – 19 мес.;
- жилые дома №№ 18, 20 по ул. Ратомской – 23 мес.

### Информация об объекте строительства

**Цель строительства** – строительство объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями по пр-т Дзержинского».

Срок начала строительства объекта – 09 августа 2018 года. Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства объекта и ввода его в эксплуатацию – 1-й квартал 2025 года.

**Строительство осуществляется на основании:**

- решений Минского городского исполнительного комитета от 07.06.2018 г. № 1866 и от 30.09.2021 г. № 2926;
- проектно-сметной документации, прошедшей в установленном порядке государственную экспертизу (заключения РУП «Главгосстройэкспертиза» № 76-15/18 от 22.03.2018 г., № 164-15/19 от 24.05.2019 г., № 71-15/22 от 24.03.2022 г., № 71-15/22-Д1 от 31.03.2022 г., № 71-15/22-Д2 от 15.06.2022 г., № 146-15/23 от 06.04.2023 г.;
- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка и прав на него № 500/249-13446 от 17.05.2023;
- договора строительного подряда на строительство объекта № 1М-ГП от 30.03.2022 г., заключенного с ООО «ТАПАС ПЛЮС»;
- извещения о получении уведомления и регистрации объекта строительства, выданного Инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 09.08.2018 № 2-203Ж-031/18.

### Сведения об объекте строительства

Земельный участок для строительства объекта расположен в Московском районе г. Минска в границах: с северо-запада – улицей Розы Люксембург и ранее сложившейся жилой застройкой средней этажности, с юго-востока – проспектом Дзержинского с расположенным вдоль проспекта отелем «Ренессанс Минск», а также бизнес-центром. Земельный участок общей площадью 0,4945 га предоставлен застройщику во временное пользование для строительства и обслуживания объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями по пр. Дзержинского».

Объект представляет собой многоквартирный жилой дом комфортной категории проживания со встроенно-пристроенными помещениями и гаражом-стоянкой закрытого типа. Жилой дом совместно со встроенными помещениями и гаражом-стоянкой образует единый 23-этажный комплекс с техническим чердаком и цокольным надземным этажом. Высота здания – 74,2 м. Здание состоит из разноэтажных объемов, в которых размещены различные по функциональным группам помещения:

- основной (высотный) 23-этажный объем в осях 1-7, А-Ж с размерами в плане по крайним осям 21,25х22,7 м. В нем размещена жилая часть и медицинский центр;
- к основному объему пристроена неотапливаемая гараж-стоянка закрытого типа, решенная в два уровня с раздельными въездами-выездами. В пристроенной части также размещены офисные помещения и расчетно-кассовый центр. Объем имеет сложную в плане форму габаритами в крайних осях 1/1-16/1 и А/1-С/1 68,7х47,6 м;
- смежно с гаражом-стоянкой размещены два отдельных здания: трансформаторная подстанция и повысительная насосная станция;
- кровля пристроенной части – эксплуатируемая, плоская совмещенная, с внутренним водостоком, решена в несколько уровней с переходными лестницами;
- кровля высотной части – плоская совмещенная, неэксплуатируемая, с внутренним водостоком.

Конструктивная схема здания **жилого дома** – монолитный железобетонный рамно-связевый каркас. Наружные ограждающие стеновые конструкции – вентфасад из алюминиевых кассет на подсистеме стальных профилей с остеклением и заполнением глухих участков минераловатными плитами, участки наружных стен – монолитные железобетонные. Внутренние стены – монолитные железобетонные. Перегородки – из блоков керамзитобетона толщиной 100 мм. Оконные проемы, остекление лоджий – структурное остекление с заполнением стеклопакетами. На лоджиях предусмотрено не менее 50 % открывающихся створок. Открывающиеся створки окон оборудованы детскими замками безопасности. Заполнение глухой подоконной части остекления принято высотой не менее 1,1 м из многослойного безопасного стекла. Двери из алюминиевого профиля, стальные.

Принятая высота этажей в отметках чистого пола:

- цокольный этаж – (перемен) 2,66…4,95 м;
- 1-й этаж – (перемен) 2,4…4,1 м;
- жилые этажи 2–19 – 2,85 м;
- жилые этажи 20–23 – 3,3 м;
- технический чердак – 2,35; 3,7 м (в чистоте).

Всего квартир в доме – 96, в том числе: 1-комнатных – 41, 2-комнатных – 42, 3-комнатных – 13.

В здании запроектированы 3 лифта грузоподъемностью 1000 кг.

**Гараж-стоянка** запроектирован в два уровня закрытого типа на 111 машино-мест. Въезды (выезды) организованы по прямолинейным двухпутным рампам. На каждом уровне предусмотрено устройство зарядных станций для электромобилей и машино-мест для транспорта маломобильных лиц. При постановке автомобилей перпендикулярно ограждающим конструкциям и вдоль рамп предусмотрено устройство колесоотбойников. Полы запроектированы с уклоном к водоотводящим устройствам. На въездах предусмотрена установка ворот.

Наружная отделка:

- стены – вентфасад с облицовкой алюминиевыми кассетами; витражное остекление; сэндвич-панели; легкая штукатурная система; ламели.

Внутренняя отделка помещений общего пользования: стены – декоративная штукатурка, потолки – покраска, подвесные потолки; покрытие пола – керамическая плитка.

В квартирах и встроенных помещениях предусмотрена подготовка под отделку (полы со звукоизоляцией и цементно-песчаной стяжкой, стены – улучшенная штукатурка; потолки – заделка швов, выравнивание поверхности).

Объект оборудуется всеми необходимыми инженерными системами и оборудованием согласно проектной документации: предусматриваются отдельные системы отопления для жилых помещений и для встроенных помещений. В жилом доме предусматриваются отдельные ветки систем отопления для мест общего пользования, лестничных клеток, технических помещений на отм. -2,680. В качестве отопительных приборов предусматриваются: низкопольные конвекторы с нижним подключением для жилых помещений, стальные панельные радиаторы для остальных помещений. Для жилых помещений проектом предусматривается приточно-вытяжная вентиляция с естественным и механическим побуждением движения воздуха. В жилом доме запроектированы следующие системы внутреннего водоснабжения и канализации: отдельные зонные системы внутреннего хозяйственно-питьевого холодного и горячего водоснабжения (1 зона – 1-6 этажи; 2 зона – 7-23 этажи), отдельная система противопожарного водопровода (система – АПТ), отдельные – системы хозяйственно-питьевого холодного и горячего водоснабжения встроенных помещений; системы бытовой канализации и внутренних водостоков; дренажная система (от кондиционеров).

В жилом доме отсутствуют жилые помещения, при заключении договоров, по которым должно отдаваться гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

В состав общего имущества объекта входят водомерный узел, ИТП, электрощитовая, коридоры общего пользования, лестницы, лестничные клетки, лифты, лифтовые и иные шахты, кровля, другие места общего пользования, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, помещение товарищества собственников, элементы озеленения и благоустройства дворовой и прилегающей к жилому дому территории.

Застройщик передает общее имущество совместного домовладения после приемки в эксплуатацию представителю товарищества собственников, а если на момент приемки в эксплуатацию объекта товарищество собственников не будет создано – лицу, определяемому общим собранием дольщиков или уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

**Комплексное благоустройство территории** включает в себя устройство проездов и парковок, пешеходных тротуаров и дорожек, устройство детских и спортивных площадок, оборудование территории малыми архитектурными формами, устройство хозяйственной площадки для ТКО, озеленение территории.

Финансирование элементов благоустройства территории производится участниками строительства жилого дома.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц предлагаются:

1) 2 квартиры, расположенные на 22-м этаже жилого дома, в том числе:

- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 9200 белорусских рублей.
- однокомнатная квартира общей площадью 60,56 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 9200 белорусских рублей.

2) 3 квартиры, расположенные на 23-м этаже жилого дома, в том числе:

- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 9700 белорусских рублей.
- трехкомнатная квартира общей площадью 116,72 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 9700 белорусских рублей.
- однокомнатная квартира общей площадью 60,56 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 9990 белорусских рублей.

3) 11 машино-мест в гараж-стоянке жилого дома. Стоимость строительства машино-места составляет 45 000 белорусских рублей;

4) 8 машино-мест в гараж-стоянке жилого дома. Стоимость строительства машино-места составляет 60 000 белорусских рублей;

5) 8 машино-мест в гараж-стоянке жилого дома с электрической зарядной станцией. Стоимость строительства машино-места составляет 100 000 белорусских рублей

6) 2 административных помещения, в том числе:

- медицинский центр общей площадью 323,70 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади расчетно-кассового центра составляет 8200 белорусских рублей.
- помещение офисов общей площадью 309,76 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади помещения офисов составляет 7500 белорусских рублей.

У застройщика действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения и иных факторов, влияющих на стоимость.

По соглашению сторон, дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости объекта долевого строительства.

### Условия оплаты

Оплата цены объекта долевого строительства производится дольщиком единовременно (в течение 5 (пяти) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме) либо в установленный договором период по графику платежей.

**Для подачи заявления и заключения договора необходимы:**

- для физического лица: личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор, с паспортом или его представителя. Документы представителя – паспорт, доверенность, оформленная в установленном законодательством порядке, копия паспорта, копия доверенности;
- для юридического лица: личное присутствие руководителя юридического лица, с которым будет заключаться договор, или его представителя. Документы – копия свидетельства о государственной регистрации юридического лица, копия Устава юридического лица, документ, подтверждающий полномочия на представление интересов.

Документы для заключения договоров будут приниматься с 12.12.2024 г. по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 173, 2-этаж, офис продаж. Время работы: понедельник – четверг 09.00–18.00, пятница 09.00–16.45, без обеда. Суббота, воскресенье выходные.

Подробные сведения об объекте долевого строительства, а также о планировках квартир и ходе строительства можно получить в офисе продаж по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 173, 2-этаж.

Тел. +375 29 3400540.

# «ЗА НЯВЕРНАСЦЬ МІКАЛАЯ З ДОМУ ВЫГНАЛА АГЛАЯ...»



**Не вам казаць: дайце чалавеку рыбу, і ён цэлы дзень будзе пад'еўшы, дайце яму вуду, і ён усё жыццё (і ўсіх) будзе даставаць сваімі рыбацкімі прыгодамі.**
**Пра вось гэту, праўда, мужчына не сам расказаў — «сведкі» здалі: на ўласныя вочы бачылі, як той з вудай ды іншым рыштункам выйшаў на лёд, як узяўся лунку свідраваць, а яму раптам «голас»: «Тут рыбы няма...» Чалавек паверыў — адступіў крыху, у новым месцы за справу ўзяўся. І... зноў пачуў, што рыбы няма! Пасля гэтага ўжо далекавата зайшоў, падумаў: «Ну, ужо тут...» — «Няма...» — ловіць вухам... «Ды скуль табе ведаць?! — псіхуе рыбак. — Хто ты такі?!» — «Я?.. Дырэктар лядовага палаца. А вось ты, мяркуючы па ўсім, хочаш нам каток сапсаваць?»**
**Якія намеры ў рыбака з чарговага конкурснага здымка (можна яшчэ раз глянуць на верхні)? Ды хто ж яго ведае! Усе надзеі былі на чытачоў. І яны, як заўжды, апраўдаліся.**

«У першых класах школы, — піша, у прыватнасці, **спадар Мікалай Старых з Гомеля**, — я вельмі шмат маляваў. А для таго, каб усе і адразу ж разумелі, што на маіх «карцінах», я іх падпісваў. Вырашыў тое ж самае зрабіць і з газетным здымкам, але...

*І гарэлку, і віно*
*Кінуў піць ужо даўно.*
*Ды бутэльку мусіў браць,*
*Бо інакш — не разабраць*
*Не дапетрыць, ну хоць трэсні,*
*Што за тып у новым крэсле.*

Ёсць у пошце адказы на гэтае пытанні, ёсць здагадкі. **Спадар Янкаў з Мінска** піша:

*Зноў не здымак, а задача:*
*Я такіх даўно не бачыў!*
*Нехта ў крэсле?*
*Але ж хіба*
*Чалавек так ловіць рыбу?*
*Колькі ж у яго кручкоў?*
*І які тады ўлоў?..*
*Тут, падобна, зноў пытальнік:*
*Можа, гэта прадпрымальнік?*

А мо — нейкі панок замежны, які з нашымі рыбакамі вопытам дзеліцца. Ну сапраўды (грэх не згадзіцца са **спадаром Мікалаем Камароўскім з Оршы**):

*Сядзець на кукішках —*
*прабачце!..*
*Хоць раз ды з крэсла*
*парыбачце!*
*Хтось пальцам крутане*
*ля скроні?*
*А вы шыкуйце —*
*як Антоній!*

Альбо — наш айчынны Піліп, пра якога так хораша распавядае **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**:

*Дэвіз у сэрвісу прыгожы:*
*«Любы капрыз*
*за вашы грошы».*
*Піліп рыбалку заказаў:*
*На возеры, з адной палаткай.*
*Для юшкі —*
*увесь набор прыпраў.*
*Ну і каб крэсла —*
*для парадку...*
*Піліп утульнасць паважаў.*

І, згадзіцеся, неяк пасвойму, досыць арыгінальна бачыў яе...

**Спадар Камароўскі** іншага арыгінала падслухаў:

*Скажу вам сёння —*
*гэта праўда:*
*Ні бацька мой,*
*ні дзед, ні прадзед*
*Ні нават іх сусед-рыбак,*
*Недакумекалі, аднак,*
*На рэчку крэсла валачы...*
*А я — адметны...*
*Хоць бы і тым!*

Дарэчная заўвага:

*Прыпёр, як дурань дзверы,*
*Фатэль на гэты бераг.*
*Сяджу і вуджу быццам...*
*А больш —*
*чым пахваліцца?!*

Здараецца, што няма... І не было. Няхай! Але ж апошнім часам усё часцей назіраецца іншае. Паводле **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска**:

*Меў сяброў, пасаду, хобі,*
*А цяпер — нібыта бобік!*
*Так міліцыя патрэсла...*
*Засталіся толькі крэсла,*
*Вуды, тачка на два колы*
*І... нікогачкі наўкола:*
*Апынуўся ў апале, —*
*Падхалімы ўраз прапалі.*

А ўжо розныя там каханкі — і пагатоў. «З той пары, як пазнаёміўся з табой, — кажа Ён, — не магу больш ні піць, ні есці...» — «Няўжо так закахаўся?» — здзіўляецца Яна. — «Не... Проста грошай не маю».

Гэта быў анекдот, зараз цэлы маналог ад **спадарыні Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны**:

*Адпачынак быў культурны:*
*У крэсле, з вудай —*
*так утульна!*
*Ёсць паклёўка, піва ёсць...*
*Йшчэ хацелася...*
*чагось!*
*Думка ў галаву прыйшла:*
*«Каб русалка падплыла».*

Іншымі словамі, Адам сумаваў: ну які ж гэта рай без жанчыны?! Бог пачуў яго і жанчыну даў. Рай скончыўся. Паводле **спадарыні Кусянковай**:

*Чакаў Ясь рыбку залатую*
*І нейк... злавіў! Але... не тую!*
*Забрала бізнес,*
*грошы, «хатку»...*
*Яму — пакінула палатку.*
*Вось гэтак Яся развяла, —*
*Сама за мора паплыла.*

Адтуль (не, не з-за мора, а з тога ж канверта) і досыць павучальная выснова:

*Не клюйце гора-мужыкі*
*Вы на русалак ля ракі:*
*Хвастом пакруціць,*
*падплыве,*
*Пазабаўляцца пазаве...*
*Ды не ў палатку, а на дно,*
*Адкуль і выйсця не відно.*

Сапраўдны сябар — ён і вораг пасля сапраўдны: трапіў чалавек у нерат... І ўсё — па віне русалкі? Ці, можа, рыбкі? (...Трэці раз прыйшоў Стары на бераг. Разбушавалася сіняе мора — падплыла да ног Залатая рыбка. І ні аб чым не спытала — дала дзеду адрас Раскольнікава.)

Аднак на беразе, разам з усім дабром, на думку **спадара Гаўрыша**, можна апынуцца і па волі жонкі:

*Ясь не гультай...*
*Ды ўсё ж бывала,*
*Што Яня голас павышала:*
*«Ад крэсла с... адарві —*
*Сходзі хоць рыбы налаві!»*
*Ясь адгукнуўся на прызыў,*
*Ён жонцы дагадзіць быў*
*рады...*
*Сабраў рыбацкія прылады...*
*Але ж і крэсла прыхапіў.*

Амаль пра тое ж — у радках **спадара Старых**:

*Мой сусед — прымак Мікола*
*Быў заўзятым рыбаловам!*
*Не, каб дома штось*
*зрабіць, —*
*Ля вады штодня сядзіць!*
*Жонка плакала, крычала,*
*А нарэшце — усё ж прагнала:*
*Паляцелі ўслед манаткі:*
*Крэсла, вуды і палатка.*

З правілаў жыцця: калі ты нешта страціў — радуйся, што страціў не ўсё...

Ну сапраўды: шмат што засталося!

«З аднаго боку, сюжэт на здымку самы звычайны: рэчка, рыбак, — піша **спадарыня Раіса Ісакава з Чавушчыны**. — А з іншага... Як жа хораша чалавек сядзіць! Я толькі зірнула на яго, і адразу ўспомніўся верш Успенскага: «За город начал рыбак собираться. // Удочку взял, чтобы рыбу ловить, // взял дождевик, чтобы им укрываться, // взял самовар, чтобы чай кипятить. // Взял он кровать, чтобы спать на кровати...» «Нешта падобнае, — працягвае **спадарыня Ісакава,** — напрошваецца і тут». Заўважым — не толькі ёй:

*Мо з паўгода рыхтаваўся*
*Ясь да адпачынку:*
*Ледзь прычэп утрамбаваўся*
*І... Дзесь праз гадзінку...*
*Не Канары, не Анапа —*
*Волма сустракае!*
*...Не ўмясцілася канапа,*
*Вось што засмучае!*

Прынамсі — **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды**. **Спадарыню Ісакаву** — трохі іншае:

*Янка доўга спіс складаў:*
*І таму — усё чыста ўзяў:*
*Крэсла, «хатку», чарвяка,*
*Нешта выпіць, смачна з'есці...*
*Стрэнеш Янку-дзівака,*
*Паспрабуй давесці:*
*Трэба — вуды і рака!*
*А не мякка сесці.*

«Гледзячы, дзе, у якім такім крэсле», — сцвярджае **спадар Іван Клімковіч з Мінска**, маючы на ўвазе нейкае, трэба разумець, высокае?

*Усе грошы маці стрэсла, —*
*Пасадзіла сына ў крэсла!*
*Наказала, каб глядзеў,*
*Каб ніхто «не падсядзеў»...*
*Сын матулю паважае:*
*Крэсла ён з сабой цягае.*

І правільна робіць (сцеражонага бог сцеражэ!), а ўжо як сядзіць! У новым... На беразе, дзе, на думку **спадара Сабалеўскага**:

*Цуд, якая любата —*
*Рана-раненька устаць,*
*Ногі ў рэчцы спаласнуць*
*І забыцца на вайну,*
*На сусветныя турботы,*
*Цэны, грошы і работу.*
*...Не бяда, што не клюе.*
*Як жа сонейка ўстае!*

Ці не пра тое ж — у **спадарыні Ісакавай**:

*Ранне ў росах ціха ззяе,*
*Не засмужана рака...*
*Прыгажосць душу кранае,*
*Грыбніка і рыбака:*
*Шчупакі хвастамі плешчуць,*
*Акунькі да ног плывуць...*
*А найлепей — жонка з цешчай*
*Тут ніяк не дастаюць!*

Дыялог (**спадар Сабалеўскі падслухаў**):

*— Як там без мяне, каханы?*
*— Сёння зноў прачнуўся рана:*
*З паплаўкоў вачэй не зводжу.*
*— Як жа спаў?*
*На лапках... Ноччу?*
*— Ды някепска, не хвалюйся:*
*Ні разочку не прачнуўся.*
*— Калі ж вернешся дахаты?*
*— Не так часта маю святы!*

І сапраўды: «На прасторах нашай краіны вельмі шмат прыгожых мясцін, — пішуць **сужэнцы Астроўскія з Мінска**. — Але ж, глянуўшы на здымак, кожны ўспомніць свае — самыя ўлюбёныя...»:

*Полацк наш, лясы-азёры —*
*Нам раднейшых —*
*век не ўбачыць!*
*Там грыбоў і ягад — мора,*
*А ўжо сядзеш парыбачыць....*
*Падрамаць на ўсходзе сонца*
*Ты не зможаш пяць хвілін:*
*Там клююць, клююць*
*бясконца*
*Карасі ды акуні!*

Адтуль, напэўна, цалкам лагічнае:

*Азярцо, чарот, лаза...*
*Ні рыбнагляд табе,*
*Ні сведкі...*
*Браканьер бы тут спытаў:*
*«Дык чаму не ловіш сеткай?»*

А таму што нельга. І грэх. Да таго ж не ўсюды, як у Полацку ды ваколіцах... Адзін рыбак дзесь да вечара прасядзеў — нічога не злавіў: не клюе і ўсё тут!.. Але ж бачыць: нехта тоне паблізу... Ён без роздуму боўць у ваду — і выцягнуў тапельца! Дакладней — тапельніцу — ну вельмі прыгожую дзяўчыну: на руках на бераг вынес. «Ты — мой выратавальнік! — шэпча красуня. — Я ўсё, што хочаш, для цябе зраблю!» — «Тады скажы, — просіць мужчына, — рыба ў гэтай рэчцы ёсць ці не?»

Прынцыповае пытанне — для абсалютнай большасці вудароў!

Думкі меншасці (і вось гэтага, з крэсла, таксама) агучыў **спадар Камароўскі**:

*Я ў фатэлі сяджу...*
*Я на вуды гляджу,*
*А клюе/не клюе,*
*Не хвалюе мяне.*

Горш за тое:

*Рыбачу — бачыце ж?! —*
*рыбачу...*
*На родненькай*
*прыродзе, значыць...*
*А што паблізу насвінячыў, —*
*Я ўжо такі — не мог іначай!*

Ці не пра такога ж, «нямоглага», і радкі **спадарыні Чыгрынавай**:

*Ой, мяняў Пятро жанок!..*
*Пырхаў — нібы матылёк!*
*Прывячалі дзеўкі, бабы,*
*Як прыбытак меў не слабы...*
*Апусцелі сейфы з часам?*
*Адвярнуліся ўсе разам:*
*З Пецем — крэсла ды шмаццё...*
*Пачынай наноў жыццё!*

Як ёсць так ёсць: калі вы не цэніце сваёй сям'і — у вас не будзе сям'і, якая цэніць вас.

Якраз пра тое ж і **спадарыня Кусянкова**:

*За няверфнасць Мікалая*
*З дому выгнала Аглая*
*У пакеты транты склала*
*І туды, дзе быў, паслала...*
*А ён знае, дзе ён быў?!*
*Што, калі і з кім рабіў?!*

Ну, сапраўды, — крохкае наша жыццё! А ўжо сам чалавек... Стаіць — варыкоз, сядзіць — гемарой, ляжыць — пролежні, не есць — дыстрафія, есць — язва, п'е — цыроз, любіць — інфаркт...

Анекдот: «Зайшоў у аптэку, паглядзеў на цэны, зразумеў: хварэць — гэта для багатых». Мы, дасць бог, не будзем — хворымі...

З назіранняў бывалых: калі доктар скажа чалавеку, што дні яго палічаны, амерыканец напіша тастамент, француз — завядзе каханку, рускі — накупляе гарэлкі, немец — знойдзе іншага доктара і паправіцца... Што зробіць беларус?

А няхай адказ на гэтае пытанне будзе дадаткам да новага конкурснага здымка! Што датычыцца вось гэтага, «старога», то завяршыць агляд хацелася б радкамі **спадара Гаўрыша**:

*Маладыя гады —*
*Самы светлы ўспамін:*
*У фатэлі такім*
*Было месца дваім.*
*І сядзець мілата...*
*А цяпер — па чарзе:*
*Паўната, цесната...*
*На калені сабе*
*Возьмеш хіба ката.*

І гэта — ну згадзіцеся — бяспройгрышны варыянт! Асабліва зімой, ля цёплай печкі, з добрай кніжкай ці газетай... Бо, як той казаў, «всё в этом мире суета! Остановись, погладь кота!» А пад настрой — прыдумай подпіс (можна некалькі, але ў кожным не больш за восем радкоў) да новага здымка.



